ЧЫМ ЖЫВЕ МІНСКІ РАЁН

4

ЯК КУПІЦЬ ПУСТЫ ДОМ?

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

17 СНЕЖНЯ 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 244 (29613)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

КАРАТКА

• Міністр аховы здароўя Дзмітрый Піневіч назваў практыкаарыентаванасць візітоўкай беларускай медадукацыі.

• **Пераможцаў конкурсу «Пазнай Беларусь» назавуць сёння ў Мінску.**

• Тры лабараторыі Мінска будуць выдаваць вынік ПЛР-тэста на COVID у дзень здачы аналізу.

• **Перспектывы лічбавай будучыні абмеркавалі на форуме #GBCregions у Бабруйску.**

• Выпушчаны паштовыя маркі з выявай беларускіх медалістаў Гульняў у Токіа.

• **Прыём работ на конкурс дзіцячага малюнка «Нам свет завешчана берагчы» стартуе 1 студзеня.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Вячаслаў КАРАТКЕВІЧ, начальнік упраўлення маніторынгу якасці адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі:

«У сучасным свеце назіраецца такая тэндэнцыя, што трывалыя веды страчваюць каштоўнасць, таму што назапасілася такая колькасць ведаў, якую чалавек ужо не можа засвоіць. Разам з тым інтэрнэт адчыняе практычна бязмежныя магчымасці, каб атрымліваць іх. Вялікую каштоўнасць набываюць soft skills (гнуткія навыкі), сярод якіх адзначаюць крэатыўнасць. Гэта тое, на што накіраваны адукацыйны працэс у школах».

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Нам трэба мабілізаваць усе рэсурсы, каб і наш народ, і непрыяцелі бачылі, што мы — дзяржава, якая адбылася»

У Палацы Незалежнасці абмяркоўвалі супрацьдзеянне санкцыйным мерам

Нарада з Прэзідэнтам Беларусі праводзілася шырокім складам. Запрасілі на яе каля 40 чыноўнікаў — прадстаўнікоў эканамічнага блока, губернатараў, кіраўнікоў прадпрыемстваў, міністраў. Але тэмы для абмеркавання не абмежаваліся толькі развіццём эканомікі ў санкцыйны перыяд. Прэзідэнт выказаўся пра неправамернасць уздзеяння на асоб, якія падпісаліся за альтэрнатыўных кандыдатаў на выбарах, адзначыў, каму можна карыстацца забароненымі тэлеграм-каналамі і якім НКА знойдзецца месца ў нашай краіне.

Фота Белтā.

«ГЭТА ДАДЗЕНАСЦЬ»

Прэзідэнт адзначыў: беспрэцэдэнтны санкцыйны ціск на Беларусь працягнецца, таму ўлады павінны разумець, як дзейнічаць у такіх абставінах і не дапускаць памылак.

«У свеце шмат краін, супраць якіх увесь час прымяняюцца неабгрунтаваныя дыскрымінацыйныя меры. Прыклад таму — наша суседняя Расія. На жаль, гэта стала нормай, а на парушэнне міжнароднага права ніхто не глядзіць. Ствараецца ўражанне, што асоб, якія прымаюць такія рашэнні, пакінуў розум», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён упэўнены, што калектыўны Захад не пакідае спроб знізіць узровень інтэграцыйнага ўзаемадзеяння ў Еўразіі, а калі гаворка ідзе пра ціск на нашу эканоміку, то ўдар нацэлены яшчэ і на дабрабыт беларускіх грамадзян.

«Санкцыі ёсць, і гэта дадзенасць. Больш за тое, яны ўжо сталі часткай нашага жыцця. Уведзены чарговы комплекс мер супраць нас. ***Нягледзячы на тое, што яны будуць мець пэўны негатыўны эфект, нам трэба працягваць жыць і спакойна працаваць, захаваўшы дынаміку працы галін нашай эканомікі»,*** — дадаў кіраўнік краіны.

Ён звярнуўся да прысутных на нарадзе: хацеў бы пачуць не ацэнкі магчымых наступстваў, а прапановы па мінімізацыі іх уплыву і мерах у адказ.

ГУЛЬНЯ Ў САНКЦЫІ

Па словах Прэзідэнта, зараз адзін з самых няпростых этапаў жыцця краіны — санкцыі, ковід, спробы расхістаць нашу стабільнасць знутры з мэтай змянення дзяржаўнага курсу.

«Але, нягледзячы на гэтыя і іншыя выклікі, неабходна не дапусціць пагаршэння асноўных эканамічных паказчыкаў і, самае галоўнае, абараніць людзей, захаваць хоць бы на ўзроўні бягучага года іх дабрабыт. Гэта задача датычыцца ў літаральным сэнсе ўсіх прысутных. Таму я і сабраў вас у такім шырокім складзе», — акцэнтуе Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго, «санкцыйныя гульні» ні ў якай меры не павінны адбіцца і на маючых адбыцца ўнутрыпалітычных падзеях.

«Рана ці позна мы выйдзем з гэтай гонкі санкцый і антысанкцый. Але пакуль вымушаны адказваць на ціск, які працягваецца. Нашы контрмеры не нацэлены на нейкую дробязную помсту. Задача — выкарыстоўваць умовы, якія склаліся, нам на карысць», — сцвярджае кіраўнік краіны.

СТАР. 2

Спажывец

НАВАГОДНІ НАСТРОЙ

У якую суму ён абыдзецца сёлета?

Што за Новы год без ялінкі, скажам мы ўслед за героем савецкага мультыплікацыйнага шэдэўра і адправімся на пошукі галоўнага сімвала Новага года і ўпрыгожванняў да яго.

СТАР. 19

«Лес» ёлак у сталічным ГУМе.

Разумныя грошы

БЯРОМ ЧУЖЫЯ, АДДАЁМ — СВАЕ

Як узяць крэдыт і не ўгразнуць у даўгах

Крэдыт — зручны фінансавы інструмент, калі ведаць, як ім правільна карыстацца. Аднак пазычаныя грошы патрабуюць адказнасці, дысцыпліны і правільнага падыходу да выбару крэдыту. Мы пагаворым сёння аб тым, як пазбегнуць сапсаванай крэдытнай гісторыі і галаўнога болю.

ГРОШЫ «НА ЗУБЫ» АБО ЗУБЫ НА ПАЛІЦУ?

Нядаўна калега цікавілася ўмовамі па крэдытах, якія даюць пад пратэзаванне зубоў. Гэта так званыя крэдыты на лячэнне. На такі выпадак банкі прапануюць мноства варыянтаў, па якіх вам дадуць грошы ў доўг, праўда, на невялікі прамежак часу.

СТАР. 6

Кожны дзень – са «Звяздой»!

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2022 года, — у падарунак чатыры календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцавы

ISSN 1990 — 763X

«Нам трэба мабілізаваць усе рэсурсы, каб і наш народ, і непрыяцелі бачылі, што мы — дзяржава, якая адбылася»

КОНТРМЕРЫ НЕ Ў ШКОДУ

Аляксандр Лукашэнка падкрэслівае: ад контрмер не павінны пацярпець людзі. Таму трэба насычаць рынак неабходнымі таварамі і не дапускаць росту цэн.

«Жыццё паказвае, што, як толькі намячаецца дэфіцыт, тут жа ажываюць шэрыя схемы і рознага роду дзялкі, якія ўбудоўваюцца ў разамкнуты ланцужок руху прадукцыі. Цяпер жулікаў, якія жадаюць зарабіць звыш прыбытку, не менш, і адзін Камітэт дзяржкантролю тут не зможа справіцца», — акцэнтаваў увагу Прэзідэнт.

Ён нагадаў пра вопыт суседзяў, якія жывуць у санкцыях, — забароненая прадукцыя знойдзе каналы пранікнення і з'явіцца на рынку, толькі ўжо па завышаных цэнах.

«Мы дзясяткі гадоў мэтанакіравана ўкладвалі велізарныя сродкі ў развіццё аграпрамысловага комплексу і вытворчасць тавараў народнага спажывання. Людзі нас не разумеюць, калі, прыходзячы ў краму, бачаць усветныя цэны на айчынную прадукцыю. Ды што тут казаць пра санкцыі. Давайце разбяромся без усякіх санкцый у навядзенні парадку ў нашай краіне», — звярнуўся да чыноўнікаў кіраўнік дзяржавы.

Па яго словах, губернатарам даручалася прывесці ў парадак закупку кармавых дабавак, бо паміж калгасамі і закупшчыкамі існуе мноства разнастайных пасярэднікаў.

Прэзідэнт адзначыў, што спакойнага жыцця за тое, што мы змагаемся за сваю зямлю і за права быць гаспадарамі на ёй, нам ніхто не абяцаў. «Таму ***зараз як ніколі нам трэба мабілізаваць усе рэсурсы — вытворчыя, тэхналагічныя, фінансавыя, інтэлектуальныя — для таго, каб і наш народ, і непрыяцелі бачылі, што мы — дзяржава, якая адбылася»,*** — кажа кіраўнік краіны.

А для гэтага ўраду, Нацыянальнаму банку, мясцовым уладам і парламентарыям неабходна выпрацаваць комплекс мер па падтрымцы і развіцці ўнутранага патэнцыялу, пашырэнні вытворчасці запатрабаваных тавараў і паслуг, мяркуе Прэзідэнт. І гаворка ідзе не аб дапамозе грашыма ці льготамі: варта проста прыбраць застарэлыя бар'еры, перашкоды, непатрэбныя ўзгадненні. Кіраўнік краіны прапануе перанесці «цэнтр цяжару прыняцця рашэнняў» на старшынь аблвыканкамаў.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнт упэўнены: калі айчынныя вытворцы гатовыя заняць унутраны рынак, дзе да гэтага гаспадарылі замежныя канкурэнты, неабходна даць ім зялёнае святло і аказваць максімальнае садзейнічанне.

«Думайце, як дапамагаць такім ініцыятывам. Жадаю, каб мяне пачулі ўсе: ад старшыні сельвыканкама да прэм'ер-міністра, праваахоўных і кантралюючых органаў. Калі патрэбны дадатковыя паўнамоцтвы губернатарам для хуткіх рашэнняў на месцах, унясіце прапановы неадкладна», — дадаў Прэзідэнт.

Ён нацэліў усіх працаваць на вынік. «Ёсць вынікі — ёсць работа. Няма выніку — да сустрэчы! Ідзе вайна. І зараз не да паперак і птушачак», — заяўляе Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, меры ў адказ на санкцыі, якія ўжо прыняты і яшчэ будуць выпрацаваны, — не характэрная пазіцыя нашага народа.

«У нас у крыві няма духу вайны, і не мы яе пачалі. Таму мы заўсёды адкрыты да канструктыўнага дыялогу на раўнапраўнай аснове без умоў і ўльтыматумаў», — канстатуе Прэзідэнт.

КІРАЎНІКІ, КАНАЛЫ І ФОНДЫ

Радуе Аляксандра Лукашэнку, што ва ўрадзе і Нацбанку няма прыкмет істэрыі або нервовасці з-за санкцый. Такі дзелавы настрой трэба захоўваць і далей, але супакойвацца не варта. «Я шмат пра гэта казаў на ўсходзе краіны. ***Неабходная маналітнасць і выканаўчасць.*** Разбярыцеся асабліва з кіраўнікамі. Вельмі шмат у нас кіраўнікоў, што займаюць антыдзяржаўную пазіцыю», — сказаў Прэзідэнт.

Асабліва, па яго меркаванні, гэта характэрна для сталічных устаноў аховы здароўя.

«Шмат там разумных з'явілася, што гатовы за прэм'ер-міністра, кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, кіраўнікоў парламента працаваць. Ніхто нікому не забараняе мець свой пункт гледжання. Гэта дадзенасць. Але ўсе прысутныя тут і кіраўнікі, пра якіх я сказаў, абмежаваныя рамкамі — рамкамі кіраўніка. Калі ты хочаш быць абсалютна незалежным, заклікаць да санкцый, ваяваць супраць улады — у Літве, Польшчы яны сядзяць. Там яшчэ ёсць вакансіі», — кажа Аляксандр Лукашэнка.

Але калі кіраўнік узначальвае калектыў, працуе на дзяржаўнай ці ваеннай пасадзе, заявіў Прэзідэнт, неабходна аддаваць справаздачу сваім дзеянням. «У адваротным выпадку мы будзем расцэньваць гэта як здраду», — акцэнтуе Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заяўляе, што нельга прымяняць нейкія меры ўздзеяння ў адносінах да людзей, якія выказалі падчас выбараў іншую палітычную пазіцыю.

«Бачыце: «Хтосьці за кагосьці падпісаўся, хапай і цягні...» Мы павінны бачыць такіх людзей у дзяржаўным апараце. Усіх жа не ўбачым. ***Іх тысячы былі, хто падпісаўся за альтэрнатыўшчыкаў. І што? Мы што цяпер будзем іх лавіць? Нам жа справай неабходна займацца. І, паверце, за гэты год яны абсалютна іншымі людзьмі сталі,*** — заўважыў Прэзідэнт. — Гэтых падпісантаў мы павінны бачыць, асабліва калі яны працуюць дзесьці наверсе, у вертыкалі ўлады. Але сёння іх лавіць і пытацца з іх? Навошта?»

З тымі, сцвярджае Прэзідэнт, хто парушаў закон у выбарчы перыяд, неабходна разабрацца. «Рабіць гэта неабходна акуратна, не павінна быць кампанейшчыны, бо мы ператворымся ў нейкіх варвараў, і паляцяць нявінныя галовы», — акцэнтаваў кіраўнік краіны.

Ён адзначыў: трэба займацца справай, весці за сабой людзей і правяраць іх на канкрэтных справах. ***«Спуску нікому не павінна быць, хто вінаваты, хто здраднік, хто проста не наш чалавек. Але яшчэ раз падкрэсліваю: гэта карпатлівая, спакойная работа спецыяльных органаў улады»,*** — дадаў Прэзідэнт.

Па словах Прэзідэнта, яму прапанавалі складаць спісы службовых асоб, каму можна будзе карыстацца экстрэмісцкімі тэлеграм-каналамі.

«Глупства несусветнае. Дастаткова аднаго падпісанта, каму па спісах будзе дазволена, і ўсе будуць карыстацца гэтым тэлеграм-каналам, глядзець. Будзе скажоная пазіцыя. Хай кіраўнікі на месцах (губернатары, старшыні райвыканкамаў) вызначаюцца. Забароны ніколі не прыводзілі да нармальнага выніку. Калі мы ўжо самі сабе не давяраем, неабходна сапраўды беглым аддаць гэтую ўладу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэслівае, што літасці да тых, хто спрабаваў перавярнуць краіну, не будзе. І такіх асоб выяўляюць сотнямі, а замежныя арганізацыі, што фінансавалі гэтую дзейнасць, ліквідаваны.

«І яны сёння ўзвылі: «Аднавіце». Яны ніколі не будуць адноўленыя. ***Любыя фонды, любыя арганізацыі могуць у нас існаваць, але займацца канкрэтнай справай на карысць Айчыны. Хай абараняюць хворых, лечаць ковід, чарнобыльцам дапамагаюць, бяздольным, асобам з абмежаванымі магчымасцямі, лечаць дзяцей»,*** — заявіў Прэзідэнт і прапанаваў стварацца адпаведныя фонды.

Марыя ДАДАЛКА.

Каментарый у тэму

Па асноўнай тэме нарады выступіў з дакладам **першы намеснік прэм'ер-міністра Мікалай СНАПКОЎ.** Па яго словах, краіны, што ўводзяць санкцыі, вельмі суб'ектыўна выбіраюць прадпрыемствы ў Беларусі, на якія распаўсюджваюцца абмежаванні. Прымяняецца, дадаў першы віцэ-прэм'ер, прынцып: уключаю, каго хачу.

«Відавочна, калі санкцыі не дадуць выніку, яны будуць узмацняцца, і іх кірунак спрагназаваць праблематычна», — мяркуе першы віцэ-прэм'ер.

Ён выдзяляе тры каналы санкцый у адносінах да нашай краіны: фінансавая сфера, экспарт і імпарт тэхналогій.

Па яго словах, за 10 месяцаў сёлета ў замежных банках затрыманы сродкі на суму 10 мільёнаў долараў ЗША, заблакіравана на сёння больш чым 200 тысяч долараў.

«Адчувальнымі з'яўляюцца ўведзеныя пятым пакетам санкцыі ЗША супраць беларускага дзяржаўнага доўгу. Гэта прамая рызыка магчымасці яго рэфінансавання, у тым ліку па ўнутраных валютных дзяржпазыках», — сказаў Мікалай Снапкоў.

Ён паведаміў, што ў прапрацоўцы заключэнне стабілізацыйнай праграмы з Еўразійскім фондам стабілізацыі і развіцця. Яна прадугледжвае выдзяленне крэдыту Расійскай Федэрацыяй на суму 3,5 мільярда долараў ЗША.

• **Кампетэнтна**

Прынятыя ЕС санкцыйныя дакументы закранаюць нацыянальныя інтарэсы Беларусі

Аб гэтым заявіў **старшыня Канстытуцыйнага суда Пётр МІКЛАШЭВІЧ,** агучваючы рашэнне Канстытуцыйнага суда па справе «Аб адпаведнасці агульнапрызнаным прынцыпам і нормам міжнароднага права дакументаў, прынятых (выдадзеных) Еўрапейскім саюзам і некаторымі замежнымі дзяржавамі і іх органамі, якія прадугледжваюць увядзенне абмежавальных мер у адносінах да Рэспублікі Беларусь», паведаміла БелТА.

«Канстытуцыйны суд лічыць, што прынятыя Еўрапейскім саюзам і некаторымі замежнымі дзяржавамі дакументы, якія закранаюць асобныя фізічныя і юрыдычныя асобы Беларусі, ствараюць пэўныя складанасці ў дзейнасці суб'ектаў гаспадарання ў розных галінах эканомікі, ускладняюць рэалізацыю сацыяльна-эканамічных, грамадзянскіх правоў і свабод грамадзян, прадугледжаных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і асноватворнымі міжнароднымі прававымі актамі, што ў канчатковым выніку закранае нацыянальныя інтарэсы Беларусі», — заўважыў Пётр Міклашэвіч.

Канстытуцыйны суд лічыць, што прымяненне абмежавальных мер у адносінах да Беларусі, парушаючы парадак, вызначаны ўстаноўчымі дакументамі ААН, з'яўляецца ўмяшаннем ва ўнутраныя справы суверэннай дзяржавы, што супярэчыць пунктам 1 і 7 арт. 2 Статута ААН. «Згодна з Хартыяй эканамічных правоў і абавязацельстваў дзяржаў, ні адна дзяржава не можа прымяняць у адносінах да іншай дзяржавы і заахвочваць эканамічныя, палітычныя або якія-небудзь іншыя меры прымусовага характару, накіраваныя на ўшчамленне яе суверэнных правоў або на атрыманне з гэтага якой-небудзь выгады», — падкрэсліў Пётр Міклашэвіч.

Старшыня КС адзначыў, што Беларусь у сваёй знешняй палітыцы выходзіць з прынцыпу роўнасці дзяржаў, непрымянення сілы або пагрозы сілай, непарушнасці граніц, мірнага ўрэгулявання спрэчак, неўмяшання ва ўнутраныя справы і іншых агульнапрызнаных прынцыпаў і нормаў міжнароднага права, якія гарантуюць правы і свабоды грамадзян, замацаваныя ў Канстытуцыі і прадугледжаныя міжнароднымі абавязацельствамі дзяржаў, «што замацоўваюць абавязак дзяржавы прымаць усе даступныя ёй меры для стварэння ўнутранага і міжнароднага парадку дня, неабходнага для поўнага ажыццяўлення правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь, прадугледжаных Канстытуцыяй».

Медыяпрастора

Працаваць на мэтавую аўдыторыю

Мы павінны змагацца за кожнага чытача, інакш станем проста незапатрабаванымі. Такі пункт гледжання выказаў міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ на пленуме праўлення Беларускага саюза журналістаў, паведамляе БелТА.

«Ідзе трансфармацыя журналістыкі. І наколькі адэкватна мы будзем успрымаць гэтыя змяненні і адэкватна на іх рэагаваць, ад гэтага і залежыць поспех нашай беларускай журналістыкі. Ці будзем мы заставацца лідарамі і ўплываць на грамадскае меркаванне і свядомасць людзей, ці будзем фарміраваць меркаванне або ж будзем глытаць пыл? Мы трансфармаваліся — і гэта асноўны пасыл сёння. Мы спачатку не адрэагавалі належным чынам на ўсе сучасныя выклікі журналістыкі. Чатыры гады таму Прэзідэнт, выступаючы на вялікім форуме, сказаў, што СМІ мяняюцца, але тады мы не асабліва разумелі, як менавіта яны будуць мяняцца», — сказаў міністр.

Паводле яго слоў, за гэты час ад фактаў і каментарыяў класічная журналістыка перайшла ў крыху іншую плоскасць. «Цяпер з'явіўся інтэрнэт, і ўстройствам для любога журналіста стаў мабільны тэлефон. І любы чалавек з адукацыяй або без яе можа лічыць сябе журналістам, з'явілася так званая грамадзянская журналістыка. Што яна нам прынесла? У першую чаргу грамадзянская журналістыка прынесла нам хуткасць падачы матэрыялу, аператыўнасць. Аднак мы атрымліваем іншы выклік — канкурэнцыя інтарэсу. Мы павінны змагацца за кожнага чытача, інакш станем проста незапатрабаванымі. Трэба разумець, што СМІ для ўсіх не бывае, таму мы павінны сегментаваць патрэбы мэтавай аўдыторыі і працаваць для яе», — адзначыў Уладзімір Пярцоў.

У сваю чаргу старшыня праўлення Беларускага саюза журналістаў Андрэй Крывашэеў выказаў некалькі асноўных тэзісаў, якія вызначаюць сёння парадак дня айчыннай журналістыкі.

«Мы бесперапынна змагаемся за суверэнную палітыку, за сваю грамадзянскую супольнасць, а адбываецца гэта ва ўмовах гібрыднай, інфармацыйнай вайны. Прычым галоўным фактарам поспеху любой рэдакцыі з'яўляюцца не тэхналогіі і тэхналагічная база, не рэсурсы і не грошы, якія мае рэдакцыя, а менавіта чалавечы капітал: якасць работы, патрыятызм, крэатыўнасць, прафесіяналізм, грамадзянская пазіцыя тых журналістаў, якія вядуць гэтую інфармацыйную вайну і існуюць ва ўмовах інфармацыйнай вайны, — падкрэсліў ён. — Яшчэ адзін фактар — вяртанне да традыцыйных крыніц праверанай і праўдзівай інфармацыі: друкаваных СМІ, радыё, тэлебачання, інтэрнэт-парталаў або акаўнтаў і тых новых медыя, якія ствараюць нашы класічныя СМІ. Гэты працэс ідзе ва ўсім свеце. Мы павінны скарыстацца гэтым «вяртаннем», каб нарасціць сваю аўдыторыю, не страціўшы даверу свайго новага чытача. Нельга забываць і пра фарміраванне аўдыторыі вакол рэдакцыі і любога таленавітага журналіста».

Сацыялогія

У прыярытэце — захаванне сацыяльных гарантый

А больш за ўсіх насельніцтва давярае Прэзідэнту

Такой пазіцыі прытрымліваецца больш як 72 % рэспандэнтаў, якія сталі ўдзельнікамі маштабнага сацыялагічнага даследавання «Беларусь: меркаванне пра будучыню», ініцыятарамі якога выступілі Інстытут сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук і Аналітычны цэнтр ЕсооМ. Акрамя таго, беларусы ў большай ступені давяраюць арміі, царкве і праваахоўным органам.

— Высокі ўзровень даверу да Прэзідэнта, а таксама да ключавых дзяржаўных інстытутаў сведчыць аб тым, што наш народ адзіны ў сваім імкненні захаваць сумесна з дзяржаўнай уладай і асноўнымі праваахоўнымі органамі тую стабільнасць і ўстойлівы вектар развіцця на гэтых высокіх хуткасцях, — адзначыла **першы прарэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Святлана ВІНАКУРАВА.** — Фігура Прэзідэнта і найбольш уразлівая з аднаго боку, і паказальная з другога. Прэзідэнт — гарант Канстытуцыі, той палітыкі, якую праводзіць наша дзяржава. Наша грамадства па-ранейшаму арыентуецца на захаванне сацыяльных гарантый.

У апытанні прынялі ўдзел 10 217 рэспандэнтаў — людзі, занятыя ў эканоміцы. У выбарку трапіла таксама моладзь, навучэнцы ВНУ і сярэдніх спецыяльных устаноў. На пытанне, **якія ініцыятывы Прэзідэнта краіны з'яўляюцца найбольш значнымі,** 43,7 % апытаных назвалі захаванне суверэнітэту і незалежнасці Беларусі, 38,7 % — падтрымку шматдзетных сем'яў, 31,8 % — жыллёвую палітыку. 27,6 % рэспандэнтаў вызначылі ўмацаванне абараназдольнасці краіны, 24,8 % — інтэграцыю Беларусі і Расіі ў межах Саюзнай дзяржавы, 23,6 % — патрыятычнае выхаванне моладзі.

На пытанне **аб адносінах беларусаў да ўстанаўлення і прызнання Дня народнага адзінства,** якое сёлета мы адзначалі ўпершыню, абсалютная большасць (34,4 %) выказалася аб тым, што новае свята толькі аб'яднала нас як нацыю. 24,5 % рэспандэнтаў выказалася аб тым, што Дзень народнага адзінства ўмацаваў наш суверэнітэт і незалежнасць. 17,5 % апытаных ахарактарызавалі гэты факт як аднаўленне гістарычнай справядлівасці.

• Даслоўна

Наталля ЭЙСМАНТ, прэс-сакратар Прэзідэнта:

«Вялікая і вельмі важная работа была праведзена ў рамках апублікаванага сёння сацыялагічнага апытання. Яно не першае і не апошняе. Падобныя апытанні, самага рознага аб'ёму і зместу, з'яўляюцца ў СМІ. Некаторыя праходзяць у закрытым выглядзе. Дарэчы, і дадзенае апытанне першапачаткова насіла закрыты характар. Прызначалася для кіраўніцтва краіны, аналізу тэндэнцый, якія адбываюцца ў нашым грамадстве. Але Прэзідэнтам было прынята рашэнне апублікаваць яго для шырокай аўдыторыі».

Адказваючы на пытанне, **ці патрэбна беларусам абноўленая Канстытуцыя,** 27,9 % мяркуюць, што патрэбна, 30,8 % — хутчэй патрэбна, чым не. Прычым большасць рэспандэнтаў (36,6 %) плануе прыняць удзел у рэферэндуме па зменах у Канстытуцыі. **Найбольш неабходнымі зменамі ў Канстытуцыю** беларусы лічаць захаванне асноўных сацыяльных гарантый (67,8 %), захаванне гарантый бяспекі (39,1 %), пашырэнне грамадзянскіх правоў і свабод грамадзян (28 %), пераразмеркаванне паўнамоцтваў паміж асноўнымі галінамі ўлады (15,1 %) і інш.

— Мы не толькі абнародваем лічбы, гаворым аб канкрэтных выніках, гэтыя даныя павінны быць прадметам не толькі нашага асэнсавання, але і вельмі сур'ёзнай работы, — заўважыў **дырэктар Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Мікалай МЫСЛІВЕЦ.** — Па ўсіх пытаннях вельмі мала тых, хто сышоў ад прамога адказу, вызначэння сваёй пазіцыі, але ў пэўных пытаннях значны працэнт тых, хто ўвогуле не вызначыўся са сваёй пазіцыяй. Гэты рэсурс трэба задзейнічаць у плане ўзаемадзеяння ў працоўных калектывах, зносін з людзьмі, якія знаходзяцца з намі побач. Гэта магутны пласт работы, які выцякае з прадстаўленых меркаванняў.

Акрамя таго, падчас даследавання **вывучаліся меркаванні людзей наконт таго, як яны адносяцца да санкцый супраць Беларусі. Кіраўнік Аналітычнага цэнтра ЕсооМ Сяргей МУСІЕНКА** агучыў наступныя лічбы. Удзельнікі апытання ва ўсіх абласцях і ўзроставых групах выказалі негатыўнае стаўленне (71,3 працэнта) да ўвядзення супраць Беларусі санкцый (55,1 працэнта — негатыўна, 16,2 працэнта — хутчэй негатыўна). Не змаглі адказаць 16,8 працэнта апытаных. Нейтральную пазіцыю займаюць 8,5 працэнта. Пазітыўна ўвядзенне санкцый ацэньваюць 1,5 працэнта, хутчэй пазітыўна — 1,4 працэнта. «Мне хацелася б паглядзець у вочы тых 1,5 працэнта, якія адказалі «пазітыўна», таму што гэта значыць пазітыўна ставіцца да таго, што тваёй краіне будзе дрэнна. Але мы бачым, што такія людзі ў грамадстве прысутнічаюць, і гэта знайшло адлюстраванне ў тым ліку і ў апытанні», — адзначыў Сяргей Мусіенка.

На думку ўдзельнікаў апытання, **мэтамі санкцый калектыўнага Захаду супраць Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца:** азлобіць народ супраць Прэзідэнта краіны (19,1 працэнта), зрабіць наша жыццё горшым (17,9 працэнта), зрабіць эканоміку Беларусі неканкурэнтнай на сусветным рынку (15,5 працэнта), зрабіць Беларусь залежнай ад калектыўнага Захаду (12 працэнтаў), не дапусціць далейшага развіцця Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі (11 працэнтаў), адпрацаваць сцэнарый націску на Расію (7,9 працэнта).

Што датычыцца **адказнасці за наплыў і вялікую колькасць мігрантаў,** яе, па меркаванні большасці апытаных, нясуць урады краін, адкуль бягуць людзі (33,8 працэнта). У ліку вінаватых міграцыйнага крызісу грамадзяне называюць таксама краіны ЕС (24,4 працэнта), ЗША (19 працэнтаў) і НАТА (12,6 працэнта). «Мы бачым гэтыя відавочныя рэчы, у тым ліку дзякуючы рабоце СМІ і ўключанасці нашага грамадства ў інфармацыйныя патокі. Людзям гэта сітуацыя абсалютна відавочна. Хоць ёсць тыя, хто не змог адказаць, — 32,9 працэнта. Гэта якраз рэсурс, якім трэба растлумачваць гэту сітуацыю», — дадаў Сяргей Мусіенка.

У ацэнцы адносін Беларусі і Расіі 41 працэнт апытаных назвалі цяперашнія адносіны дзвюх краін як дружалюбныя, братэрскія, 35,5 працэнта — нармальныя, спакойныя. Напружанымі адносіны Беларусі і Расіі лічаць толькі 3,7 працэнта. Не змаглі адказаць 12,9 працэнта апытаных.

У найбліжэйшы час будуць апублікаваны вынікі даследавання і па іншых пытаннях.

Вераніка КАНЮТА.
Інфаграфіка БелТА.

У ЯКОЙ СТУПЕНІ ВЫ ДАВЯРАЕЦЕ:



НА ВАШ ПОГЛЯД, ЦІ ПАТРЭБНАЯ БЕЛАРУСІ АБНОЎЛЕНАЯ КАНСТЫТУЦЫЯ?



ЦІ ПЛАНУЕЦЕ ВЫ ЎЗЯЦЬ УДЗЕЛ У РЭФЕРЭНДУМЕ ПА ЗМЯНЕННЯХ У КАНСТЫТУЦЫЮ?

Блізкая ўлада

Фермеры спадзяюцца на падтрымку

Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА правёў прыём грамадзян

Фота БелТА.

Падчас прыёму і прамых ліній заўсёды бывае шмат пытанняў па арганізацыі транспартнага абслугоўвання, асабліва гэта датычыцца раёнаў новай забудовы. Так адбылося і гэтым разам.

У Брэсце ў Паўднёва-Заходнім раёне, які актыўна забудоўваецца, з улікам узвядзення медыцынскага цэнтра адкарэктавалі некаторыя маршруты гарадскіх аўтобусаў. Маршрут аўтобуса № 14 у новым раёне паменшыўся амаль на кіламетр. Дзве жыхаркі з гэтым катэгарычна не пагадзіліся. Яны звярталіся ў гарвыканкам, але прапанаваны там варыянт урэгуляванння іх не задаволіў. Жанчыны лічаць, што пакрыўджанымі засталіся працаўнікі, якія дабіраюцца на работу, а таксама сем'і, што вязуць дзяцей у садкі зранку.

Губернатар прыняў рашэнне маршрут аднавіць.

Асаблівую актыўнасць на прыёме праявілі фермеры. Яны прасілі паспрыяць у вырашэнні пытанняў, звязаных з далейшым развіццём гаспадарак. Напрыклад, ТАА «ГрынСпрайс» вырошчвае саджанцы ягад і дэкаратыўных культур у Маларыцкім раёне. Ёсць інвестар, які гатовы ўкласці ў вытворчасць каля трох мільёнаў долараў, але патрэбны яшчэ 300 гектараў зямлі.

Сямейная пара з Брэсцкага раёна займаецца развядзеннем слімакоў, працуюць на экспарт. Яны звярнуліся па дапамогу ў набыцці камбікармоў для сваёй спецыфічнай гаспадаркі.

Юрый Шулейка адзначыў, што жыхары вобласці праяўляюць актыўнасць у справе зваротаў у органы мясцовай улады, а гэта сведчыць аб іх даверы. Як відаць, спрацоўвае пагалоска: усе канструктыўныя прапановы ўважліва вывучаюцца і вырашаюцца станоўча.

Яна СВЕТАВА.

ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 18 снежня, з 9.00 да 12.00, правядуць:

• кіраўнік спраў Брэсцкага аблвыканкама Сяргей Мікалаевіч ЛАБАДЗІНСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8 021 222 22 22;

• кіраўнік спраў Гомельскага аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;

• кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Мікалай Леанідавіч ДЗЯДКОЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;

• кіраўнік спраў Мінскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Юрый Уладзіміравіч ТРУШЧАНКА. Тэл. 8 017 222 44 44.

Моцныя рэгіёнамі

ЧЫМ ЖЫВЕ ПРЫСТАЛІЧЧА?

«Мінскі раён заўсёды пад увагай», — падкрэсліў у размове з карэспандэнтам «Звязды» старшыня Мінскага райвыканкама Уладзімір ЮРГЕВІЧ. — «Усе буйныя аўтамагістралі ад сталіцы да абласных цэнтраў пралягаюць праз тэрыторыю раёна, таму ў нейкім сэнсе мы з'яўляемся своеасаблівай візіткай як Мінскай вобласці, так і краіны ў цэлым».

— Уладзімір Іосіфавіч, пагадзіцеся, што ніводны іншы раён краіны не развіваецца такімі тэмпамі, як Мінскі. Колькасць насельніцтва ў некаторых прысталічных населеных пунктах перавышае колькасць жыхароў большасці раённых цэнтраў. Але пабудаваць жыллё — гэта адно, а стварыць неабходную сацыяльную інфраструктуру — задача значна цяжэйшая. Як у Мінскім раёне вырашаецца такая праблема?

— Насельніцтва Мінскага раёна складае больш за 260 тысяч чалавек. Але адразу адзначу, што такое павелічэнне колькасці жыхароў ідзе не ад павышэння нараджальнасці, а з прычыны працэсаў урбанізацыі. Шмат жыхароў з усіх рэгіёнаў краіны марыць змяніць сваё месца жыхарства на Мінск альбо Мінскі раён. Штогод колькасць насельніцтва ў Мінскім раёне павялічваецца на 6—8 тысяч чалавек. Чаму так адбываецца? Адказ просты. Сёння працэнт беспрацоўя ў прысталіччы складае ўсяго 0,02 %. Чалавек, які пераехаў сюды на пастаяннае месца жыхарства, знойдзе працоўнае месца без якіх-небудзь праблем. Галоўнае, каб ён не быў гультаём. Але, упэўнены, лодар сюды і не паедзе.

Што датычыцца развіцця сацыяльнай інфраструктуры, то гэтую праблему мы паступова вырашаем. Зразумела, што адначасова ўвесці ў эксплуатацыю неабходную колькасць аб'ектаў дашкольнай адукацыі і сярэдніх школ нерэальна. Школ у раёне сапраўды пакуль не хапае. Каля 10 тысяч дзяцей з населеных пунктаў прысталічча навучаюцца ва ўстановах адукацыі Мінска. Блізкасць да сталіцы дазваляе выкарыстоўваць падобныя меры. Дадам, што і медыцынскае абслугоўванне часткі насельніцтва раёна ажыццяўляецца таксама ў сталіцы.

Тым не менш усе неабходныя сацыяльныя стандарты ў частцы медыцынскага абслугоўвання альбо адукацыі мы павінны выконваць. І такая работа актыўна вядзецца. Дзякуючы падтрымцы, якую аказвае нам Мінскі аблвыканкам, на тэрыторыі раёна штогод з'яўляецца ўсё больш сучасных аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры — школ, дзіцячых садкоў, паліклінік і амбулаторый.

Напрыклад, толькі летась у Мінскім раёне ўведзена ў эксплуатацыю шэсць устаноў дашкольнай адукацыі. Гэта, на мой погляд, небывалая з'ява. Ніколі раней столькі аб'ектаў адукацыі не здавалася на працягу аднаго года. Сёлета ў верасні адкрылася вялікая сучасная школа ў Калодзішчах. Дарэчы, у снежні там адкрыецца і новы дзіцячы садок. Цяпер вядзецца распрацоўка праектна-кашторысных дакументацыі на будоўлю школы і дзіцячага садка на тэрыторыі Бараўлянскага сельвыканкама. Мы не спыняемся на вырашэнні гэтай вельмі вострай праблемы, добра разумеем патрэбы людзей і паступова іх вырашаем. На жаль, апошнія 10—15 гадоў, калі будаўніцтва жылля ў Мінскім раёне ішло хуткімі тэмпамі, вырашэнню падобных пытанняў не ўдзялялася належнай увагі. Зараз даводзіцца наганяць.

— Што яшчэ робіцца для таго, каб павысіць якасць жыцця людзей?

— Адной з галоўных задач на найбліжэйшы час з'яўляецца забеспячэнне населеных пунктаў якаснай чыстай вадой. І за апошні час у гэтым плане зроблена нямала. Нашым прадпрыемствам «Водаканал Мінскага раёна» наладжаны ўласны выпуск станцый абезжалезвання. За тры апошнія гады, якія існуе гэта вытворчасць, на прадпрыемстве выпушчана каля 30 падобных станцый, якія ўстаноўлены ў населеных пунктах Мінскага раёна. Вырашаецца яшчэ адна вострая праблема, уласцівая гэтай тэрыторыі.

У прысталіччы створана больш чым 100 калектываў індывідуальнай забудовы. Выдзелены зямельныя ўчасткі, людзі пабудавалі індывідуальныя жылыя дамы. Але ў большасці з такіх арганізацый існуюць праблемы з добраўпарадкаваннем вулічна-дарожнай сеткі. У 2018 годзе мной было ініцыіравана пытанне аб перадачы ўсіх вуліц населеных пунктаў Мінскага раёна на баланс нашага раённага прадпрыемства «Мінрайгаррамаўтадар». Агульная працягласць вулічна-дарожнай сеткі ў Мінскім раёне сёння складае больш за 1700 кіламетраў. Для параўнання: да 2018-га яна складала ўсяго 420 км. Аб'ём работ па абслугоўванні і рамонце павялічыўся ў чатыры разы. Тым не менш прадпрыемства выконвае ўсе неабходныя задачы. Мы, як выканаўчая ўлада, імкнёмся дарожнікам дапамагчы, у прыватнасці, закупляем новую тэхніку для выканання дарожных работ.

Жыхары падобных населеных пунктаў часта звяртаюцца ў райвыканкам з просьбай уладкаваць вуліцы. На жаль, усім імгненна дапамагчы ў гэтым плане мы не можам. Але ёсць сярод членаў калектываў індывідуальных забудоўшчыкаў нямала ініцыятыўных людзей, якія падахвочваюць суседзяў на самастойнае вырашэнне гэтай праблемы з дапамогай дзяржаўных арганізацый. Сваімі сіламі і за кошт уласных сродкаў яны выконваюць частку работ па ўладкаванні вуліц, у прыватнасці, пакрыццё праезнай часткі пясчана-жвіровай сумессю. А дзяржаўная арганізацыя праз некаторы час ажыццяўляе асфальтаванне гэтых участкаў. У Мінскім раёне можна знайсці нямала прыкладаў такога ўдалага супрацоўніцтва. Дзякуючы яму ўладкаванне вулічна-дарожнай сеткі значна паскорылася.

— Людзі ахвотна пераязджаюць у Мінскі раён. А як увогуле развіваецца эканоміка раёна?

— Не менш актыўна прыходзіць у Мінскі раён і бізнес. Тут выгадна развіваць тут вытворчасць. Зручная лагістыка, рынкі збыту, вялікая колькасць рабочых рук і іншыя магчымасці прыцягваюць шмат дзелавых людзей. У прыватнасці, сёлета за 9 месяцаў у раёне было створана больш за 2000 новых рабочых месцаў.

Але, на мой погляд, гэты працэс усё ж неабходна стрымліваць. Стварэнне інвестыцыйных пляцовак менавіта ў Мінскім раёне выклікае адток капіталаў і працоўных рэсурсаў з іншых раёнаў вобласці і рэгіёнаў краіны. Гэты працэс патрабуе строгага рэгулявання. Мы не можам бясконца сцягваць сюды людзей. Значнае павелічэнне колькасці насельніцтва — гэта новыя праблемы сацыяльнага плана: новыя школы, дзіцячыя садкі, паліклінікі і, адпаведна, значная нагрузка на дзяржаўны бюджэт.

Што датычыцца эканомікі, то скажу, што Мінскі раён з'яўляецца асноўнай крыніцай папаўнення бюджэту Мінскай вобласці. Раён не мае патрэбы ў датацыях. Безумоўна, хацелася, каб сродкаў у раённым бюджэце заставалася больш, але мы добра разумеем, што ў іншых раёнах вобласці таксама ёсць урачы, настаўнікі, супрацоўнікі праваахоўных органаў, якім неабходна своечасова выплачваць зарплату. Дарэчы, сярэдняя налічаная заработная плата за 9 месяцаў у Мінскім раёне ва ўсіх сферах дзейнасці перавысіла 1600 рублёў. Тэмп росту ў параўнанні з мінулым годам перавысіў 110 %. У гэтым плане мы сёння саступаем толькі беларускай сталіцы. Эканоміка працуе, раён актыўна развіваецца, для людзей ствараюцца добрыя ўмовы жыцця і працы.

Сяргей РУЧАНАЎ,
фота аўтара.

(Больш навін аб развіцці Мінскага раёна — на сайце zviazda.by)

Напярэдадні

СВЯТА Ў РАДАСЦЬ

І не ва ўрон лясному фонду

Дзяржаўная лясная ахова традыцыйна пяройдзе на ўзмоцнены рэжым работы напярэдадні навагодніх свят. Пра гэта паведаміў на сустрэчы з журналістамі начальнік упраўлення лясной гаспадаркі Міністэрства лясной гаспадаркі Сяргей ЧАРНЯЎСКІ.

«Для спынення магчымых правапарушэнняў, звязаных з нарыхтоўкай навагодніх дрэў, будзе патрулявацца лясны фонд, на асобных участках дарог будуць устаноўлены пункты для праверкі транспарту на наяўнасць суправаджальных дакументаў на нарыхтаваную лесапрадукцыю», — сказаў Сяргей Чарняўскі.

Таксама ў гэты перыяд лясная ахова ўзмоцніць кантроль за індывідуальнымі прадпрымальнікамі і юрыдычнымі асобамі, якія нарыхтоўваюць навагоднія ёлкі па дазвольных дакументах. «У гэтым годзе сумесна з падатковай службай будуць арганізаваны мерапрыемствы па праверцы пунктаў рэалізацыі навагодніх дрэў на наяўнасць праваўстанаўлівальных дакументаў на лясную прадукцыю па аб'ёме, колькасці і асартыменце, — растлумачыў спецыяліст. — Гэты комплекс мер дасць магчымасць знізіць да мінімуму колькасць правапарушэнняў і захаваць лясны фонд краіны».

Акрамя таго, у распараджэнні дзяржаўнай лясной аховы ёсць сродкі відэа- і фотафіксацыі, якія размяшчаюцца ў лясным фондзе і фіксуюць правапарушэнні. «Колькасць апошніх, звязаных з нарыхтоўкай навагодніх ёлак, зніжаецца. У мінулым годзе было ўстаноўлена каля 20 такіх выпадкаў», — адзначыў начальнік упраўлення лясной гаспадаркі.

За незаконную нарыхтоўку навагодніх дрэў прадугледжана адміністрацыйная адказнасць. «Штраф будзе вар'іравацца ў залежнасці ад катэгорыі лясоў, дзе ўчынена незаконная нарыхтоўка. Пакаранне для фізічнай асобы — да 30 базавых велічынь. Таксама прадугледжана кампенсацыя шкоды, прычыненай навакольнаму асяроддзю за ссечанае дрэва», — дадаў Сяргей Чарняўскі.

Лясгасы да навагодніх свят маюць намер прадаць амаль 140 тысяч дрэў, паведаміў на прэс-канферэнцыі **начальнік упраўлення вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі Міністэрства лясной гаспадаркі Андрэй МАЦКЕВІЧ.**

«Традыцыйна гэта елка, у мінулым годзе былі трэнды на павелічэнне пакупак хвоі, добра сябе зарэкамендавалі дрэвы ў кадках, а таксама навагоднія букеты. Усяго будзе арганізавана каля 1,1 тысячы гандлёвых пунктаў», — сказаў Андрэй Мацкевіч.

Працаваць ёлачныя кірмашы будуць ва ўсіх абласных і раённых цэнтрах, на тэрыторыі лясніцтваў і лясгасаў. «Ужо 18 снежня ў Брэсцкай вобласці Івацэвіцкі лясгас пачне гандаль навагодняй прадукцыяй. Далей будуць падключацца астатнія вобласці, і з 20 снежня па ўсёй тэрыторыі краіны арганізуюць ёлачныя кірмашы», — адзначыў ён.

Мінчане змогуць набыць дрэвы па дзяржаўных цэнах ад Мінскага лясгаса па адрасе: вуліца Баграціёна, 70, а таксама на ёлачным базары на вуліцы Прытыцкага, 146, дзе гандляваць прадукцыяй будзе Рэспубліканскі лясны селекцыйна-насенняводчы цэнтр.

Па словах прадстаўніка Мінлясгаса, цэны на навагоднія дрэвы будуць прымальныя — на ўзроўні мінулага года. «Усё залежыць ад месца пакупкі і непасрэдна даўжыні дрэва. У лясніцтве навагоднія ёлкі або хвоя будуць каштаваць танней. Цэны пачынаюцца ад 9 рублёў, самыя дарагія — каля 20. Калі гаварыць аб дрэвах у кадках, іх кошт будзе стартаваць ад 15—20. Цэны на навагоднія букеты-кампазіцыі складуць 3—5 рублёў, — растлумачыў спецыяліст міністэрства.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Уласная распрацоўка

Касцёр — лёгка!

Круглянская ПМК-266 распрацавала электрапрыстасаванне для колкі дроў

Кацельныя прадпрыемствы ў горадзе і на турыстычным комплексе «Мікалаеўскія сажалкі» працуюць выключна на дровах. Да нядаўняга часу дровы тут калолі ўручную, цяпер для гэтага ёсць электрычная «сякера».

Фота krugloe.by

— Аднойчы ў інтэрнэце я наткнуўся на ідэю стварэння электрамеханічнага дрывакола, — расказвае **юрысконсульт прадпрыемства Мікалай КУРНОСАЎ.** — Калі паманіторыў гэтую тэму, хутка знайшоў некалькі варыянтаў вырабу карыснага прыстасавання. З імі звярнуўся да нашага начальніка Віталя Шумейкі. А ён даў ідэі ход.

Яе рэалізавала каманда на чале з галоўным механікам ПМК Аляксеем Заступневічам. Удзел у рэалізацыі распрацоўкі бралі загадчык майстэрняў Пётр Радчанка, газаэлектразваршчык Сяргей Харчэўка і токар Іван Жукаў. Яны ўдасканалілі прыладу і зрабілі яе перасоўчнай. Цяпер даставіць прыстасаванне да месца прызначэння не праблема. З тым аб'ёмам дроў, якія б прыйшлося калоць дзень, яна спраўляецца за некалькі гадзін, толькі паспявай падстаўляць цурбаны. Галоўнае, каб драўніна была шчыльная.

Мікалай Курносаў паведаміў, што гэта не адзіная распрацоўка прадпрыемства. Напрыклад, сёлета тут змайстравалі з поліпрапіленавых труб, металічных штыроў, пластыку і фанеры раскладныя сталы, якія змяшчаюцца ў невялічкім чамаданчыку. Калі дрывакол рабілі ў асноўным механікі, то сталы — зваршчыкі і цесляры. Гэтыя сталы спатрэбіліся, каб зрабіць перасоўчную выстаўку. Для тых, хто не ведае, у ПМК на турыстычным комплексе «Мікалаеўскія сажалкі» ёсць тры музеі — СССР, мастака Мікалая Неўрава і этнаграфічны. Сёлета ўпершыню адбылася выязная выстаўка экспанатаў у Магілёве. У прадпрыемства ёсць задумка зрабіць яшчэ адзін музей — народных вынаходніцтваў. Акрамя ўжо згаданых рэчаў, у калекцыі ёсць самаробны тэрмас са шкла, фольгі і пластыку, а таксама адпужвальнік для кратоў.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Далучайцеся!

Дабрачынны збор пад Новы год

У рамках рэспубліканскай навагодняй акцыі «Нашы дзеці» з 14 снежня да 14 студзеня аб'яўлены дабрачынны збор сродкаў. Прыняць удзел запрашаюцца юрыдычныя і фізічныя асобы.

Аказаць фінансавую дапамогу дзецям, якія апынуліся ў складаным жыццёвым становішчы, а таксама дзяцям з інваліднасцю і хворым, можа любы ахвотны найбольш спрыяльным спосабам: для фізічных асоб — з дапамогай сістэмы «Разлік», сэрвісу E-POS або адсканаваўшы QR-код; юрыдычным асобам — накіраваўшы плацеж на разліковы рахунак з пазнакай «Нашы дзеці».

Марафон дабра

З цікавай кніжкай — у новы год

Выдавецкі дом «Звязда» прымае ўдзел у Рэспубліканскай навагодняй акцыі «Нашы дзеці»

Цэнтрам увагі сталі дзіцячыя дамы. Менавіта туды прыбываюць падарункі ад нашага выдавецтва — кніжкі беларускіх пісьменнікаў з цікавымі малюнкамі. Чарговая партыя кніжнай прадукцыі прыбыла сёння ў Панямунскі дзіцячы дом горада Гродна.

Старт Рэспубліканскай навагодняй акцыі «Нашы дзеці» быў дадзены 14 снежня. У гэты ж дзень прадстаўнікі Выдавецкага дома «Звязда» наведалі дзіцячы дом у Мінскай вобласці. Гродна стаў другім горадам, куды прыехалі кніжкі. Наступным адрасам стане дзіцячы дом у Мсціславе на Магілёўшчыне, а 26 снежня кніжная прадукцыя прыбудзе ў SOS-Дзіцячую вёску ў Мар'інай Горцы.

— Сёлета Выдавецкі дом «Звязда» праводзіць традыцыйную навагоднюю акцыю «Нашы дзеці» сумесна з Беларускай універсальнай таварнай біржай», — паведаміў **намеснік дырэктара выдавецтва Уладзімір МОСІН.** — Мы прывезлі ў Панямунскі дзіцячы дом кнігі нашага Выдавецкага дома. Гэта творы беларускіх аўтараў, большасць з якіх выйшла на беларускай мове — казкі, аповесці, апавяданні, вершы, прыгодніцкія і фантастычныя гісторыі. Дзеці змогуць пазнаёміцца з творамі Міхася Пазнякова, Кацярыны Хадасевіч-Лісавой, Раісы Баравіковай, Генадзя Аўласенкі, Людмілы Рублеўскай.

Усяго ў Панямунскі дзіцячы дом дастаўлена каля 350 кніг.

Па словах **дырэктара Панямунскага дзіцячага дома Нэлі СТРАЛКОЎСКАЙ,** такі падарунак вельмі каштоўны. Дзецям варта чытаць больш добрых сучасных твораў, ведаць беларускіх пісьменнікаў. Таксама дырэктар спадзяецца, што, магчыма, хтосьці з іх у будучыні асабіста сустрэнецца з дзецьмі і раскажа аб сваёй творчасці.

Цяпер у Панямунскім дзіцячым доме пражывае 44 дзіцяці школьнага ўзросту. Усе яны знаходзяцца пад дзяржаўнай апекай. Пры гэтым не ўсе бацькі пазбаўлены бацькоўскіх правоў, але яны некаторыя не могуць выконваць свае абавязкі з-за хваробы. Большасць дзяцей — сацыяльныя сіроты. Прадпрыемствы горада аказваюць дзіцячаму дому шэфскую дапамогу. Сюды з падарункамі абавязкова прыязджаюць прадстаўнікі арганізацый і ведамстваў падчас акцыі «Нашы дзеці».

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

Дарэчы

Выдавецкі дом «Звязда» праводзіць акцыю «Навагодні падарунак» ад «Звязды» сумесна з ААТ «Белкніга» і РУП «Акадэмічная кніга». З 07.12.2021 года да 30.01.2022 года пры набыцці дзіцячай літаратуры Выдавецкага дома «Звязда» ў названых кнігарнях кожны пакупнік атрымае «Ліст Дзеду Марозу» ў падарунак.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

САЗ паведаміла аб удваенні колькасці заражаных «Амікронам» кожныя 2-3 дні

Спецыяльны прадстаўнік Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (САЗ) па барацьбе з COVID-19 Дэвід Набара заявіў аб надзвычай высокай хуткасці распаўсюджвання штама каранавіруса «Амікрон». «У нас у САЗ ёсць дастаткова інфармацыі, якая вельмі ясна паказвае, што гэты штам распаўсюджваецца вельмі хутка, з удваеннем колькасці выпадкаў кожныя два-тры дні», — сказаў ён тэлеканалу Sky News. Эксперт адзначыў, што ў такіх умовах пазбегнуць высокай смяротнасці ўдасца толькі пры вялікай удачы. Па словах Навара, ён «ніколі не быў больш занепакоены» каранавірусам, чым цяпер. Спецпрадстаўнік САЗ лічыць, што размова ідзе аб «вельмі сур'ёзнай сітуацыі» і толькі аб самым пачатку «надзвычайнага паскарэння» распаўсюджвання хваробы. Набара растлумачыў, што ў сувязі з «Амікронам» неабходна працягваць вакцынаваць насельніцтва, у тым ліку размяркоўваючы бустарныя дозы вакцын. Акрамя таго, неабходна скараціць распаўсюджванне віруса за кошт мінімізацыі сацыяльных кантактаў усім людзям без выключэння. «Я мяркую, што ў найбліжэйшыя тыдні з'явіцца вельмі сур'ёзная праблема», — адзначыў Дэвід Набара.

Налета ваенны бюджэт ЗША ўзрасце да $778 млрд

Сенат ЗША ўслед за Палатай прадстаўнікоў прагаласаваў за прыняцце праекта абароннага бюджэту ЗША на 2022 год, паведаміла агенцтва Bloomberg. Выданне The Wall Street Journal адзначыла, што праект, у прыватнасці, прадугледжвае выдзяленне $300 млн на навучанне і экіпіроўку ўкраінскай арміі. $150 млн мяркуецца накіраваць на развіццё супрацоўніцтва з краінамі Балтыі ў галіне бяспекі. Яшчэ $13,3 млрд павінны пайсці на будаўніцтва ваенных аб'ектаў і $27,3 млрд — на стварэнне ваенных караблёў. Яшчэ $4 млрд мяркуецца выдаткаваць для Еўрапейскай абароннай ініцыятывы. Таксама праект бюджэту прадугледжвае фарміраванне камісіі для расследавання акалічнасцяў вайны ЗША ў Афганістане. Усяго, паводле даных The Wall Street Journal, налета ваенныя выдаткі краіны павялічацца на пяць працэнтаў у параўнанні з папярэднім годам.

У аэрапорце Буэнас-Айрэса ўстаноўлена статуя Марадоны

Статуя былога гульца і трэнера зборнай Аргенціны па футболе Дыега Марадоны ўстаноўлена ў галоўным міжнародным аэрапорце Буэнас-Айрэса. Аб гэтым паведаміла прэс-служба кампаніі Aeropuertos Argentina 2000. «АА2000 урачыста адкрыла ў міжнародным аэрапорце Эсейса статую «Нумар 10», якая адсылае да выявы легенды футбола на чэмпіянаце свету ў Мексіцы ў 1986 годзе», — гаворыцца ў паведамленні. Статуя на поўні рост была зроблена метадам 3D-друку. «Працэс вырабу пачаўся са збору выяў Марадоны на ЧС-1986 у Мексіцы падчас гучання нацыянальнага гімна, калі ён быў засяроджаны на маючым адбыцца фінале», — паведаміла кампанія. Паводле заявы прэс-службы, уладальнік АА2000 Эдуарда Эрнекян асабіста прапанаваў Марадоне ўстанавіць яго статую, а футбаліст папрасіў, каб помнік быў устаноўлены менавіта ў аэрапорце Эсейса.

Надвор'е

З ПАНЯДЗЕЛКА — ІЗНОЎ ЗІМА

У пачатку наступнага тыдня да нас прыйдуць маразы да мінус 15—20 градусаў

На выхадных па-ранейшаму захаваецца павышаны тэмпературны рэжым і практычна паўсюдна снег растане, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Дастаткова цёпла будзе ў пятніцу і суботу. У апошні рабочы дзень тыдня ўмовы надвор'я ў краіне будзе вызначаць няўстойлівая паветраная маса, якая паступае з Фінскага заліва. Будзе воблачна з прасненнямі. У многіх раёнах пройдуць невялікія ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Месцамі чакаюцца слабыя туман і галалёд, на асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўночна-заходні, паўночны ўмераны. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад мінус 1 да плюс 5 градусаў.

Дастаткова слізка чакаецца ў суботу, калі ўначы надвор'е будуць фарміраваць няўстойлівыя паветраныя масы. Будзе воблачна з прасненнямі. Уначы месцамі, раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу, удзень з дажджом. У асобных раёнах чакаецца слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўночны, удзень з пераходам на заходні ўмераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 градусаў да 1 цяпла, удзень — ад мінус 2 да плюс 4 градусаў.

У нядзелю надвор'е будуць фарміраваць франтальныя раздзелы, звязаныя з чарговым атлантычным цыклонам. У Беларусі будзе пераважаць пахмурнае надвор'е. Пройдуць ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўночна-заходні, заходні парывісты, раніцай і ўдзень месцамі па паўднёвым захадзе краіны моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да 3 цяпла, удзень — на некалькі градусаў вышэй.

У пачатку наступнага тыдня сітуацыя ў атмасферы пачне мяняцца. Замест атлантычнага цяпла ў краіну ўжо будзе паступаць арктычнае паветра з боку Баранцава мора.

Пахаладанне пачнецца ў панядзелак. Часам будзе ісці невялікі снег. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўночны ўмераны, тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад нуля па паўднёвым захадзе да мінус 10 градусаў па паўночным усходзе краіны.

А вось з аўторка чакаецца халоднае надвор'е. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе невялікі снег, у многіх раёнах установіцца снежнае покрыва. Асобныя ўчасткі дарог будуць слізкія. Вецер прагназуецца паўночны ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе 7—14 марозу, пры праясненнях — да мінус 15—20 градусаў. Удзень будзе 5—12 градусаў ніжэй за нуль.

Сяргей КУРКАЧ.

БЯРОМ ЧУЖЫЯ, АДДАЁМ — СВАЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вось, напрыклад, самы даступны крэдыт на гэтую тэму прапануе адзін з самых вялікіх банкаў. Яго спажывецкі прадукт «На асабістае» выдаецца тэрмінам ад 3 да 12 месяцаў пад 15,9 % гадавых. Пад гэты крэдыт можа выдавацца дастаткова важкая сума — ад 500 да 10 тысяч рублёў. У рэкламе банка гаворыцца, што грошы кліенту выдадуць без даведак і паручыцеляў, а рашэнне па гэтай справе прымаецца літаральна за некалькі гадзін. Неабходнай умовай для атрымання грошай будзе наяўнасць беларускага пашпарта ці пасведчанне на права жыхарства замежнага грамадзяніна — ад 18 гадоў, а на момант заканчэння тэрміну вяртання крэдыту — не больш за 68 гадоў. Абавязковыя наяўнасць сталай рэгістрацыі і стаж не менш як тры месяцы на апошнім месцы работы.

Праўда, тут ёсць адно «але». І ў гэтым банку вам не дадуць максімальны крэдыт на кароткі тэрмін, калі ў вас дрэнная крэдытная гісторыя або недастатковы па памерах заробак. Ваша даведка аб даходах тут неабавязковая, дастаткова іншых крыніц інфармацыі.

У фінансістаў існуюць варыянты з больш доўгатэрміновымі крэдытнымі лініямі. Нават сустракаюцца суперпрацяглыя крэдыты тэрмінам ад 13 да 48 месяцаў. Але ў такім выпадку працэнтныя стаўкі па падобных крэдытах будуць ужо значна большыя за сярэднія — ад 21 % і да 40 % гадавых.

Напрыклад, спажывецкі прадукт «Крэдыт на медыцынскія паслугі» ад буйнога банка выдаюць на тэрмін ад 3 месяцаў да 2 гадоў пад 25 % гадавых. Максімальны ўзровень такога крэдыту неабмежаваны. Але ў такім выпадку банк патрабуе для забеспячэння доўгу даведку аб даходах, паручыцеляў і залог. Акрамя таго, сапраўды буйны крэдыт выдаецца на аплату медыцынскай дапамогі і паслуг, набыццё медыкаментаў, медыцынскай тэхнікі і прыбораў для грамадзян, якія знаходзяцца на дыспансерным уліку (безнаяўным пералікам на рахункі трэціх асоб).

Гэты крэдыт выдаецца выключна для набыцця медыкаментаў і медыцынскай тэхнікі і прыбораў, аплаты кошту лячэння (медыцынскай дапамогі і паслуг) заяўніка і членаў яго сям'і. Па крэдыце аплачваюцца ўсе віды лячэбных, дыягнастычных мерапрыемстваў, касметалагічных паслуг (уключаючы пластычную хірургію), карэкцыі зроку (хірургія і мікрахірургія), стаматалагічнай дапамогі і ўсіх відаў пратэзавання, іншых платных медыцынскіх паслуг.

СЛУШНЫЯ ПАРАДЫ АД БЫВАЛАГА ПРАКТЫКА...

Перш чым узяць крэдыт, неабходна зрабіць паўзу і падумаць, ці так ужо вам патрэбны гэтыя грошы і як вы будзеце вяртаць атрыманую суму. Улічвайце не толькі свой заробак ці пенсію, але і магчымыя складаныя абставіны. Звальненне, хвароба ці крызіс могуць парушыць самы прадуманы план.

Ёсць простая і важная формула: памер штомесячнага плацяжу па крэдыце не павінен перавышаць 30 % вашага штомесячнага даходу. Арыентуйцеся на гэта. А яшчэ лепш складзіце фінансавы план, каб дакладна прагназаваць даходы і выдаткі.

Не бярыце крэдыт у першым жа банку. Блізкасць аддзялення або яркая шыльда — не самы лепшы памочнік для выбару банка. Рынак поўны прапаноў, таму вывучыце варыянты ў некалькіх арганізацыях. Параўнайце ўмовы і кошт, каб выбраць крэдыт, які максімальна вам падыдзе. Не забудзьцеся пацікавіцца рэпутацыяй банка. Калі вы студэнт або пенсіянер, паведаміце аб гэтым супрацоўніку банка: магчыма, для вас дзейнічаюць спецыяльныя прапановы.

Не падпісвайце дагавор, калі не разумееце яго ўмоў. Не лянуйцеся прачытаць увесь тэкст, гэта сэканоміць вам час і грошы ў далейшым. Уважліва вывучыце ўсе ўмовы выдачы і пагашэння крэдыту. Звяртайце ўвагу на камісіі, штрафы за пратэрміноўку плацяжоў, дадатковыя ўмовы накшталт страхавання. Калі нешта незразумела, пытайцеся ў супрацоўнікаў банка, патрабуйце растлумачыць, пракансультуйцеся з юрыстам.

Выконвайце графік выплат і не адкладвайце чарговы плацеж на апошні момант. Мае сэнс заставіць 5—7 рабочых дзён да даты плацяжу, каб грошы паспелі паступіць на рахунак. Не лішнім будзе паставіць напамін у смартфоне або павесіць яркі стыкер на бачное месца. Калі з'явілася магчымасць пагасіць крэдыт загадзя, скарыстайцеся ёю. Гэта засцеражэ вас ад магчымых праблем у будучыні — раптам узнікнуць складаныя абставіны і вы не зможаце заплаціць чарговы ўзнос.

...І ДЗЕЛАВЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ГАЛОЎНЫХ ФІНАНСІСТАЎ

Нацыянальны банк ведае пра крэдыты практычна ўсё. Ён нават распрацаваў канкрэтныя парады тым, хто сабраўся скарыстацца чужымі грашыма.

Па-першае, тым, хто вырашыў скарыстацца крэдытам, трэба выразна ўсведамляць: яго неабходна вяртаць строга ў адпаведнасці з умовамі крэдытнага дагавора, а таксама выплаціць банку працэнты за карыстанне грашыма. Таму варта рэальна ацаніць, наколькі стабільныя вашы даходы і ці зможаце вы своечасова і ў поўнай меры ажыццяўляць плацяжы па крэдытным дагаворы. Падумайце і крытычна ацаніце неабходнасць звароту па крэдыт. Пажадана, каб крэдыт браўся на сапраўды неадкладныя і абгрунтаваныя мэты.

АБ ПАДПІСАННІ ДАГАВОРА

Да заключэння крэдытнага дагавора банк абавязаны прадставіць кліенту ў пісьмовым выглядзе пад подпіс зместкі аб умовах крэдытавання, форма і змест якіх з'яўляюцца ўніфікаванымі. Гэтая інфармацыя даецца бясплатна, а яе падпісанне не з'яўляецца заключэннем крэдытнага дагавора і не азначае ўзнікнення якіх-небудзь абавязацельстваў у чалавека.

Перад падпісаннем крэдытнага дагавора трэба старанна вывучыць яго. Неабходна ўважліва і ўдумліва прачытаць усе пункты крэдытнага дагавора. Дзеля гэтага, па магчымасці, можна ўзяць дакумент дадому, дзе больш уважліва вывучыць яго ўмовы, абавязацельствы бакоў, каб пераканацца, што крэдытны дагавор не ўтрымлівае умоў, пра якія вам невядома або сэнс якіх няясны. Пытанне выбару віду крэдыту лепш разбіраць індывідуальна, паколькі ўсё залежыць менавіта ад таго, які вынік хочацца атрымаць.

Будзеце браць крэдыт разава, або магчымая сітуацыя, калі трэба будзе яшчэ раз звярнуцца па крэдыт? Якая сума патрэбная — невялікая або наадварот? Як доўга будзеце карыстацца крэдытнымі сродкамі і гэтак далей... На ўсе гэтым пытанні варта мець дакладны адказ перад падпісаннем дагавора.

РОЎНЫМІ ПЛАЦЯЖАМІ АБО ДЫФЕРЭНЦЫРАВАНА

Вяртаць крэдыт і выплачваць працэнты за карыстанне ім можна рознымі спосабамі. Парадак разліку плацяжоў варта вывучыць таксама да заключэння крэдытнага дагавора. Пры адной і той жа працэнтнай стаўцы, у залежнасці ад спосабу пагашэння, плацяжы па працэнтах могуць адрознівацца. Асноўныя спосабы пагашэння крэдыту — роўнымі плацяжамі (ануітэт) і з памяншэннем сумы штомесячнага плацяжу (дыферэнцыраваны). Пры роўнай стаўцы і тэрміне, агульная сума працэнтаў прыануітэце большая. Апраўданнем такой пераплаты можа служыць магчымасць штомесяц траціць на пагашэнне крэдыту меншую суму (пры той жа стаўцы і тэрміне, штомесячныя плацяжы прыануітэце будуць спачатку істотна ніжэйшыя, чым пры дыферэнцыраваным пагашэнні).Ануітэт зручны для крэдытаатрымальніка з пункту гледжання раўнамернай нагрузкі на сямейны бюджэт.

Крэдыт на спажывецкія патрэбы крэдытаатрымальнік мае права вярнуць датэрмінова, без паведамлення банку. Пры гэтым неабходна выплаціць працэнты за фактычны тэрмін карыстання крэдытам.

КРЭДЫТ МОГУЦЬ І НЕ ДАЦЬ

Абавязковыя ўмовы прадастаўлення крэдыту прадугледжваюцца банкамі самастойна. Банкі ацэньваюць крэдытаздольнасць заяўніка на падставе шматфактарнага аналізу, у тым ліку ацэньваюць заяўлены кліентам узровень атрымання даходаў, магчымасць своечасова рэгулярна пагашаць крэдыт, а таксама працэнты за карыстанне ім у адпаведнасці з умовамі крэдытнага дагавора.

Таксама вывучаюцца звесткі, якія ўтрымліваюцца ў крэдытных гісторыях. Даючы крэдыт на спажывецкія патрэбы, банк выкарыстоўвае паказчык пазыковай нагрузкі. Ён разлічваецца як працэнтныя суадносіны памеру штомесячнага плацяжу па аперацыях крэдытнага характару да памеру сярэднямесячнага даходу крэдытаатрымальніка. Гэты паказчык не павінен перавышаць 40 %. Пры выдзяленні крэдыту на фінансаванне нерухомасці банк выкарыстоўвае ў тым ліку паказчык забяспечанасці крэдыту, які разлічваецца як працэнтныя суадносіны сумы крэдыту да кошту аб'екта нерухомасці, які прымаецца ў заклад у якасці забеспячэння. Памер яго не павінен быць больш як 90 %. Перавышэнне названых паказчыкаў можа быць прычынай адмовы ў выдачы крэдыту. Акрамя таго, банкі маюць права не заключаць крэдытны дагавор, калі ёсць звесткі аб тым, што прадстаўленую суму крэдыту атрымальнік не верне своечасова.

Разам з тым, у выпадку адмовы банкам рэкамендавана даступна, аргументавана і кампетэнтна растлумачыць заяўнікам прычыны, па якіх прынята адмоўнае рашэнне аб выдзяленні крэдыту.

ІСТОТНЫЯ ЎМОВЫ КРЭДЫТНАГА ДАГАВОРА

Згодна з заканадаўствам, у любым крэдытным дагаворы павінны прысутнічаць істотныя ўмовы: сума, тэрмін і парадак выдзялення і вяртання (пагашэння) крэдыту. А таксама памер працэнтаў за карыстанне крэдытам і парадак іх выплаты. У гэтым пераліку і адказнасць крэдытадаўца і крэдытаатрымальніка за невыкананне або неналежнае выкананне абавязацельстваў па крэдытным дагаворы. Пры вызначэнні ў крэдытным дагаворы парадку выдачы і вяртання крэдыту банк абавязаны прапанаваць адзін з такіх бясплатных спосабаў. **Спаганяць якія-небудзь дадатковыя плацяжы (камісійныя і іншыя ўзнагароджанні) за карыстанне крэдытам банкам забаронена.** Гэта значыць выдаткі, звязаныя з выдачай і вяртаннем крэдыту, банк павінен уключаць у працэнтную стаўку (напрыклад, па разглядзе дакументаў, суправаджэнні крэдыту, выпуску і абслугоўванні дадатковай карткі і іншыя).

АБ ЗАПАЗЫЧАНАСЦІ

Кліент банка мае права атрымліваць інфармацыю аб запазычанасці па крэдытным дагаворы па запыце бясплатна як мінімум раз на месяц. Гэта звесткі аб суме запазычанасці па дагаворы адносна асноўнай сумы доўгу па крэдыце, працэнтах за карыстанне ім, а таксама наконт пратэрмінаванай запазычанасці. У выпадку апошняй, банк абавязаны інфармаваць крэдытаатрымальніка ў тэрмін не пазней за 30 дзён з дня яе ўзнікнення. Дадзеныя мерапрыемствы таксама праводзяцца бязвыплатна.

Сяргей КУРКАЧ.

❍ У тэму

БУДЗЬЦЕ ПІЛЬНЫЯ!

Апошнім часам пашырэнне атрымала фальшывае выдзяленне анлайн-крэдытаў. Пад выглядам работнікаў банка махляры тэлефануюць і паведамляюць, што да іх звярнуўся нехта з даверанасцю на імя патэнцыйнай ахвяры і паспрабаваў аформіць крэдыт. Пільны «супрацоўнік» нібыта западозрыў нядобрае, пасля чаго кліент уцёк. Потым ашуканцы паведамляюць, што афармленне крэдыту яшчэ можна прадухіліць. Трэба толькі ў асабістым кабінеце па інтэрнэт-банкінгу ўвесці нумар свайго пашпарта. Пры гэтым «банкаўскі работнік» увесь час паўтарае: не перажывайце, вы не паведамляеце нам важную інфармацыю, мы ўсё бачым па сістэме.

Потым на картку неасцярожнага чалавека прыходзіць значная сума грошай. «Супрацоўнікі банка» супакойваюць: гэта крэдытныя грошы, яны знікнуць з карткі, як толькі дагавор будзе ануляваны. Праз дзве-тры хвіліны іх сапраўды не стане. Разам з астатнімі грашыма на вашай картцы. Проста ашуканцы пераводзяць ўсю суму на рахунак іншага банка...

Следчы камітэт нагадвае:

— не паведамляйце рэквізіты банкаўскай карткі (нумар, тэрмін дзеяння, трохзначны код на адваротце), пін-код іншай асобе;

— не пераходзьце па спасылках, якія дасылаюць невядомыя суразмоўнікі;

— не перадавайце даныя для ўваходу ў сістэму інтэрнэт-банкінгу;

— пры паступленні званкоў з «папяроджаннем» аб ашуканскіх дзеяннях, прапановай дыстанцыйнага адкрыцця выгаднага дэпазіту і спробах атрымаць рэквізіты картак, завяршыце размову і ператэлефануеце па афіцыйным нумары call-цэнтра банка;

— раскажыце аб мерах бяспекі пажылым сваякам.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
17 снежня 2021 г. № 49 (634)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

НЕРУХОМАСЦЬ

Фота з архіва Анатоля КЛЕШЧУКА.

КУПІЦЬ ПУСТЫ ДОМ І НЕ ХВАЛЯВАЦЦА, ШТО АДШУКАЕЦЦА ЯГО БЫЛЫ ГАСПАДАР

Мы падрыхтавалі пакрокавы алгарытм — дзе знайсці такое жыллё і як стаць яго ўласнікам

Як вядома, у нашай краіне ўступіў у сілу ўказ аб адчужэнні жылых дамоў на вёсцы. Нагадаем, што яшчэ вясной Прэзідэнтам быў падпісаны Указ «Аб адчужэнні жылых дамоў у сельскай мясцовасці і ўдасканаленні работы з пустымі дамамі», накіраваны на далейшае ўдасканаленне ўключэння ў абарот нявыкарыстаных жылых дамоў і зямельных участкаў, а таксама на спрашчэнне парадку набыцця грамадзянамі жылых дамоў у сельскай мясцовасці. У канцы восені ён уступіў у сілу, але ў зацікаўленага насельніцтва засталіся пытанні аб практычным прымяненні дадзенага дакумента.

Таму спецыялісты Дзяржаўнага камітэта па маёмасці распрацавалі дакумент, у якім на гэтыя пытанні даюцца вычарпальныя адказы. Мы ж, са свайго боку, пачыталі яго больш уважліва.

Дзе знайсці пустыя дамы?

Усе ахвотныя набыць пусты жылы дом павінны звярнуцца ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган па месцы рэгістрацыі дадзенага жылля.

Таксама варта ўлічваць, што да 1 студзеня 2023 года раённыя, гарадскія выканаўчыя камітэты, мясцовыя адміністрацыі раёнаў у гарадах фарміруюць рэестры пустых жылых дамоў і размяшчаюць адпаведныя звесткі ў адкрытым доступе на сваіх сайтах.

Такім чынам, у мясцовым выканаўчым і распарадчым органе можна атрымаць інфармацыю аб пустых жылых дамах, выстаўленых на продаж праз аўкцыён або без правядзення аўкцыёну. Там жа можна даведацца і аб іх цане, парадку набыцця, а таксама іншыя нюансы наконт зямельных участкаў, якія могуць быць выдзелены новаму землекарыстальніку з умовай зносу альбо фінансавання зносу пустога жылога дома гэтым суб'ектам.

Дадзены ўказ прадугледжвае, што з пачатку 2023 года будзе пачата фарміраванне Дзяржаўнага інфармацыйнага рэсурсу «Адзіны рэестр пустых дамоў». Ён ствараецца для аўтаматызацыі дзейнасці выканкамаў, павышэння інфармаванасці насельніцтва, забеспячэння абароны іх правоў і законных інтарэсаў. Доступ да гэтага дакумента атрымаюць усе ахвотныя бясплатна.

Як набыць?

Пасля таго як кліент выбера сабе той ці іншы аб'ект, ён заяўляе аб намеры яго купіць. Нагадаем, што продаж такіх жылых дамоў магчымы на аўкцыёне, у тым ліку шляхам правядзення электронных таргоў, ці без правядзення аўкцыёну.

Пачатковая цана продажу пустога дома вызначаецца па рыначным кошце, устаноўленым арганізацыяй па дзяржаўнай рэгістрацыі.

А цяпер самае цікавае — якой будзе цана. Тут прадугледжваецца магчымасць правядзення паўторных аўкцыёнаў, а таксама продаж без правядзення аўкцыёну з паступовым зніжэннем пачатковай цаны не больш чым на 50 % уключна, затым не больш чым на 80 % уключна, затым ажно да адной базавай велічыні (29 рублёў).

стар. 18

ЮБІЛЕЙ

Пераемнасць традыцый і развіццё вытворчасці

Са 150-годдзем Мінскага вагонарамонтнага завода павіншавала яго работнікаў Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.

Спікер верхняй палаты парламента павіншавала работнікаў аднаго з найстарэйшых прадпрыемстваў краіны з юбілеем.

— Мінскі вагонарамонтны завод — гэта сучаснае прадпрыемства, якое аказвае шырокі спектр паслуг, у тым ліку па комплексным рамонце вагонаў і чыгуначнай тэхнікі, — гаворыцца ў віншаванні. — Маючы статус прамысловай вытворчасці, вы выконваеце і важную сацыяльную місію. Дзякуючы плённай і эфектыўнай рабоце кожнага з вас забяспечваюцца зручнасць, камфорт і бяспека пасажыраў чыгуначнага транспарту.

Наталля Качанава выказала асаблівую ўдзячнасць ветэранам прадпрыемства за добрасумленныя адносіны да справы і самаадданую працу.

— Вашы бясцэнны вопыт і адданасць прафесіі заслугоўваюць павагі і шчырага захаплення, — падкрэсліла яна.

Спікер выказала ўпэўненасць, што кампетэнтнасць, энергія, самаадданасць работнікаў вагонарамонтнага завода, а таксама багатыя традыцыі іх папярэднікаў будуць і ў далейшым садзейнічаць устойліваму развіццю прадпрыемства і эфектыўнаму вырашэнню задач, якія стаяць перад імі.

У канцы Наталля Качанава ад усёй душы пажадала юбілярам моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту і новых дасягненняў у гонар роднай Беларусі.

МЕРКАВАННЕ

Таццяна РУНЕЦ:

«Спробам перапісаць ход гісторыі неабходна супрацьстаяць»

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах аб прынятым у другім чытанні дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў законе «Аб генацыдзе беларускага народа»:

— Я глыбока перакананая ў тым, што любым спробам перапісаць ход гісторыі і фальсіфікаваць падзеі і вынікі Другой сусветнай вайны неабходна даваць самы рашучы адпор. Мы назіраем, як калектыўным Захадам, ды і некаторымі псеўдагісторыкамі, якія імкнуцца да заходняй сістэмы каштоўнасцяў, заціраюцца відавочныя факты генацыду беларускага народа ў гады Другой сусветнай вайны, усяляк абяляюцца злачынцы, на руках якіх кроў ні ў чым невінаватых людзей. Мы, заканадаўцы, павінны супрацьстаяць такім спробам умяшання ў гістарычны кантэкст!

Гэта неабходна тым, хто загінуў, — для захавання памяці пра мільёны савецкіх людзей, якія сталі ахвярамі ваеннай агрэсіі. Гэта неабходна нам, жывым, цяперашняму і будучаму пакаленням — для таго каб не дапусціць паўтарэння страшнай катастрофы, якую спазнала чалавецтва менш за сто гадоў таму. Для нас, беларусаў, гэта найбольш важна, бо менавіта наша тэрыторыя станавілася галоўнай арэнай ваенных баталій.

Я цалкам падтрымліваю ініцыятыву прыняцця гэтага закона, бо праз восем дзясяткаў гадоў з пачатку Другой сусветнай вайны ўсё часцей і часцей гучыць думка, якая адмаўляе факт генацыду беларускага народа. Лічу своечасовымі прынятае гэтага закона і ўвядзенне ў Крымінальны кодэкс адпаведнага артыкула, які ў якасці санкцыі прадугледжвае абмежаванне і пазбаўленне волі за публічнае адмаўленне гістарычных фактаў. Тым больш профільныя дакументы — Канвенцыя аб папярэджанні злачынстваў генацыду і пакаранняў за яго (1948 г.), Канвенцыя аб непрымянімасці тэрміну даўнасці да ваенных злачынстваў і злачынстваў супраць чалавецтва (1968 г.) — накіраваны на заканадаўчае забеспячэнне абароны фундаментальных каштоўнасцяў і ўстанаўленне бар'ераў на шляху да ўсялякіх спроб фальсіфікаваць ход гісторыі.

ПАДАТКІ, ДАХОДЫ, ВЫДАТКІ...

У Савеце Рэспублікі на пасяджэнні профільнай камісіі разгледзелі «бюджэтны пакет»

ВЫКАНАННЕ рэспубліканскага бюджэту ў гэтым годзе, якія даходы і выдаткі плануюцца ў наступным, навацыі Падатковага кодэкса разгледзелі на пашыраным пасяджэнні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, якое адбылося ў рэжыме відэаканферэнцыі. Сітуацыю на бюджэтным рынку краіны сенатарам растлумачыла кіраўніцтва Міністэрства фінансаў.

АТРЫМАЛІ БОЛЬШ ЗАПЛАНАВАНАГА

Адкрываючы пасяджэнне, **старшыня профільнай камісіі верхняй палаты парламента Таццяна РУНЕЦ** акцэнтавала ўвагу на тым, што на экспертным савеце пры Савеце Рэспублікі ўжо разглядаліся плануемыя новаўвядзенні, аднак больш падрабязныя тлумачэнні — для сенатараў, якія ўваходзяць у склад Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах для выкарыстання імі звестак пры зносінах з насельніцтвам і працоўнымі калектывамі. Яна адзначыла: неабходна ўжо цяпер тлумачыць, што нас чакае ў 2022 годзе, асабліва наконт змяненняў у Падатковым кодэксе ў адносінах да дзейнасці прадпрымальнікаў.

Як расказаў **міністр фінансаў Юрый СЕЛІВЕРСТАЎ,** каментуючы папярэднія вынікі выканання бюджэту 2021 года, сёлета даходы бюджэту паступаюць з істотным перавышэннем запланаваных параметраў. У прыватнасці, зацверджаны законам аб бюджэце аб'ём даходаў рэспубліканскага бюджэту (нагадаем, ён склаў 23,3 мільярда рублёў. — **«Зв.»**) на сённяшні дзень ужо выкананы.

> «Як і раней, бюджэтныя рэсурсы ў будучым годзе будуць сканцэнтраваны на выкананні асноўных мэт, вызначаных Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця на пяцігодку, — падкрэслівае Юрый Селіверстаў. — У ліку прыярытэтных кірункаў фінансавання — павышэнне ўзроўню дабрабыту грамадзян».

— Паводле ацэнкі, дадаткова паступіць 4,1 мільярда рублёў, — кажа міністр. — У цэлым па годзе даходы складуць 27,4 мільярда рублёў.

Дарэчы, гэтая сума дадаткова з'явілася з некалькіх крыніц: падаткаў на дабаўленую вартасць і прыбытак, ад некаторых мытных пошлін і збораў і іншага.

Паводле яго слоў, расходы рэспубліканскага бюджэту ацэньваюцца ў памеры 30 мільярдаў рублёў. У параўнанні з зацверджанымі, павелічэнне складае 2,6 мільярда.

Дадатковыя расходы сёлета пайшлі на аплату працы бюджэтнікаў, перш за ўсё ў сферы аховы здароўя, набыццё вакцыны ад каранавіруснай інфекцыі і іншых медыкаментаў, дзяржпадтрымку сельгасвытворцаў, рамонт аўтадарог і некаторыя іншыя патрэбы. Міністр звярнуў увагу на такі факт: у пераліку на насельніцтва краіны выдаткі на закупку лекаў склалі амаль па 200 рублёў на кожнага.

Паводле яго ацэнкі, дэфіцыт фактычна будзе ў два з паловай раза меншы, чым чакалі ў пачатку года — не больш за 2,5 мільярда рублёў.

ШТО ЗМЕНІЦЦА?

Юрый Селіверстаў расказаў таксама аб падатковай палітыцы і праекце бюджэту на будучы год. Паводле яго слоў, змяненні і дапаўненні ў Падатковы кодэкс арыентаваныя, у асноўным, на тое, каб стаўкі асобных падаткаў адпавядалі патрабаванням часу. Што прапануецца ў прыватнасці?

Па-першае, стандартная індэксацыя на інфляцыю ставак па плацяжах, устаноўленых у абсалютных значэннях. Так, праіндэксаваны на 7,2 % стаўкі зямельнага, экалагічнага падаткаў і некаторых іншых. Стаўкі падатку на ігральны бізнес, індэксацыя якіх не рабілася ўжо на працягу трох гадоў, праіндэксаваны на 10 %.

— На тытунёвыя вырабы акцызы павялічваем з апярэджаннем — на 15 %, а таксама ўводзім акцыз на вадкасці для электронных сістэм курэння, — патлумачыў ён.

Па-другое, прадугледжваюцца дадатковыя меры, накіраваныя на павелічэнне даходаў бюджэту. Пра што гаворка? Так, з 1 студзеня 2023 года ўводзяцца павышаныя стаўкі зямельнага падатку ці арэндная платы за аб'екты, тэрмін будаўніцтва якіх перавышае тры гады. Таксама ўводзіцца ПДВ для замежных арганізацый і прадпрымальнікаў пры электронным дыстанцыйным продажы тавараў (напрыклад, гэта будзе датычыцца такіх інтэрнэт-пляцовак як Wildberries і Ozon). Дарэчы, гэтае абавязацельства для папулярных анлайн-сэрвісаў пачне дзейнічаць толькі з 1 ліпеня 2022-га.

Фота БелТА.

УЛАДАЛЬНІКАМ КВАТЭР ТРЭБА ВЕДАЦЬ!

З адчувальных мер — адмена льготы па падатку на нерухомасць у адносінах да кватэр у шматкватэрных жылых дамах.

— Гэта забяспечыць аднолькавы падыход у падаткаабкладанні ўласнікаў індывідуальных збудаванняў, у тым ліку ў сельскай мясцовасці, якія ўжо сёння з'яўляюцца плацельшчыкамі гэтага падатку, з уласнікамі нерухомасці ў шматкватэрных дамах, — тлумачыць **першы намеснік міністра фінансаў Дзмітрый КІЙКО.**

Паводле яго слоў, такая мера, акрамя іншага, пашырыць рэсурсныя магчымасці мясцовых бюджэтаў, за кошт сродкаў якіх праводзіцца добраўпарадкаванне прыдамовых тэрыторый, замена ліфтаў і выкананне іншых работ.

Як падлічылі ў Міністэрстве фінансаў, гэты крок дадаткова прынясе ў бюджэт 21 мільён рублёў. У разліку на аднаго ўладальніка кватэры на 60 метраў, напрыклад, у сталіцы сума падатку на год будзе складаць 49 рублёў, у абласным цэнтры — 41 рубель, у раёне — 27 рублёў. Плацельшчыкамі будуць выключна працаздольныя грамадзяне.

Як падкрэслілі на пасяджэнні профільнай камісіі, для пенсіянераў, шматдзетных сем'яў і інвалідаў ільгота захаваецца.

Як трэба будзе плаціць падатак на нерухомасць?

Не пазней за 15 лістапада 2022 года трэба будзе ўнесці аванс за бягучы год па падатку на нерухомасць на падставе паведамлення падаткавай інспекцыі, якое павінна быць уручана плацельшчыку не пазней за 1 верасня 2022-га. Аванс будзе складаць 50 % ад сумы падатку.

Другую частку трэба заплаціць не пазней за 15 лістапада 2023 года, зноў жа, на падставе паведамлення, якое павінна паступіць не пазней як 1 верасня гэтага года.

І ТЫМ, ХТО ПРАЦУЕ НА СЯБЕ...

Міністр фінансаў таксама паведаміў, што перагледжаны падыходы па падаткаабкладанні індывідуальных прадпрымальнікаў, самазанятых грамадзян і мікрарганізацый. У іх аснове — павышэнне ўдзелу гэтых катэгорый у фарміраванні даходнай часткі бюджэту. У прыватнасці, прапануецца **для ІП з 1 студзеня 2022-га скараціць пералік відаў дзейнасці,** якія абкладаюцца адзіным падаткам, павялічыць стаўкі гэтага падатку ад 2,3 да 4 разоў з дыферэнцыяцыяй па рэгіёнах. Змены адчуюць тамады, артысты размоўнага жанру, танцоры, распрацоўшчыкі вэб-сайтаў, гандляры вопраткай з натуральнай скуры, цырульнікі і некаторыя іншыя. У Мінску стаўкі адзінага падатку для іх павялічацца ў чатыры разы, у Мінскім раёне — у 2,83, у буйных гарадах — у 2,27, у іншых населеных пунктах — у 2,33 раза.

Таксама ў адносінах да ІП, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць у сферы паслуг, прапануецца **выключыць магчымасць выкарыстання спрошчанай сістэмы падаткаабкладання.** Выключэннямі стануць такія сферы, як турызм, ахова здароўя, транспарт, грамадскае харчаванне, камп'ютарнае праграмаванне.

Для ІП прапануецца **адмяніць выплату ПДВ** пры выкарыстанні спрошчанай сістэмы падаткаабкладання, замацаваўшы адзіную стаўку падатку ў памеры 6 %. Дарэчы, цяпер гэтая лічба складае 5 %. А з 2023-га наогул адменяць выкарыстанне ІП спрошчанай сістэмы падаткаабкладання, захаваўшы пры гэтым магчымасць аплаты адзінага падатку толькі па асобных відах дзейнасці. Па ўсіх астатніх відах давядзецца плаціць падатак ад розніцы паміж даходамі і выдаткамі.

Што датычыцца **самазанятых,** у адносінах да такой катэгорыі Мінфін прапануе **пашырыць пералік відаў дзейнасці,** па якіх аплачваецца адзіны падатак, павялічыўшы стаўкі па ім у 2-2,3 раза ў залежнасці ад рэгіёна. А з 2023-га дадаткова да адзінага **ўвесці падатак на прафесійны даход** у працэнтах ад выручкі, ён будзе адміністравацца на базе лічбавай платформы, якая дазваляе ажыццяўляць прыём безнаяўных плацяжоў.

Што дадуць гэтыя навацыі? Па ацэнцы профільнага міністэрства, прапанаванае павелічэнне ставак адзінага падатку для ІП і самазанятых дазволіць прыцягнуць у бюджэт каля 130 мільёнаў рублёў.

ЯКІМ БУДЗЕ БЮДЖЭТ-2022?

— Ва ўмовах знешняга ціску, які ўзмацняецца, захоўваюцца рызыкі, здольныя негатыўна паўплываць у будучым годзе на выкананне бюджэту, — кажа Юрый Селіверстаў. — Паўнавартасна спрагназаваць іх немагчыма. Таму для фарміравання бюджэту абраны сцэнарый сацыяльна-эканамічнага развіцця, які прадугледжвае «стрыманы» рост ключавых параметраў.

Паводле яго слоў, даходы кансалідаванага бюджэту прагназуюцца ў памеры 47,2, рэспубліканскага — 27,8 мільярда рублёў, або з ростам да бягучага года на 6 %. Выдаткі вызначаны ў памеры 50,4 (канасалідаваны) і 30,7 мільярда рублёў (рэспубліканскі бюджэт) з ростам на 4,4 %. Дэфіцыт прапануецца зацвердзіць у суме трох мільярдаў рублёў, што менш, чым планавалася на бягучы год. Міністр сцвярджае, што крыніцы яго фінансавання ёсць.

— Як і раней, бюджэтныя рэсурсы ў будучым годзе будуць сканцэнтраваны на выкананні асноўных мэт, вызначаных Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця на пяцігодку, — падкрэслівае Юрый Селіверстаў. — У ліку прыярытэтных кірункаў фінансавання — павышэнне ўзроўню дабрабыту грамадзян.

Паводле яго слоў, у структуры бюджэту доля выдаткаў на выплату заробку бюджэтнікам складзе 38 %. Захаваецца і станоўчая дынаміка фінансавання найважнейшых сацыяльных выдаткаў: гэта трансферты Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва, выплата сямейнага капіталу, выдаткі на падтрымку жыллёвага будаўніцтва для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Міністр сцвярджае: усе іншыя выдаткі максімальна аптымізаваны. Бягучыя выдаткі ўлічваюць прагназаваную інфляцыю і тарыфы на камунальныя паслугі.

Гаворачы аб мясцовых бюджэтах, кіраўнік Міністэрства фінансаў адзначае, што разліковыя паказчыкі на іх на 2022 год сфарміраваны з выкарыстаннем адзіных падыходаў з рэспубліканскім бюджэтам.

— Агульны аб'ём фінансавых рэсурсаў мясцовых бюджэтаў складзе 26,6 мільярда рублёў, рост — 105,3 % да 2021 года, — кажа Юрый Селіверстаў.

Пры гэтым для павышэння падатковай аўтаноміі рэгіёнаў у наступным годзе прапануецца даць абласным і Мінскаму гарадскому Саветам дэпутатаў права павялічваць стандартную стаўку падатку на прыбытак (якая цяпер складае 18 %. — **«Зв.»**) у межах двух працэнтных пунктаў.

— Выкарыстанне гэтай нормы ацэньваецца ў 160-300 мільёнаў рублёў дадатковых даходаў для мясцовых бюджэтаў, — растлумачыў міністр.

Паводле яго слоў, выкарыстоўваць згаданыя сродкі прапануецца на фінансаванне інжынернай, транспартнай інфраструктуры, будаўніцтва мясцовых дарог, а ў сталіцы — Мінскага метрапалітэна. Ён дадаў, што разліковыя паказчыкі па мясцовых бюджэтах на 2022 год узгоднены ўсімі губернатарамі без заўваг.

— Падрыхтаваны праект бюджэту ўлічвае фінансавыя рэсурсы, якія маюцца, і накіраваны, перш за ўсё, на вырашэнне задач сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ў цэлым і асобных рэгіёнаў з улікам неабходнасці захавання ўстойлівасці бюджэтнай сістэмы і макраэканамічнай стабільнасці, — рэзюмаваў міністр фінансаў.

Адзначым, што праект рэспубліканскага бюджэту ўжо прыняты ў першым чытанні дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў.

Вольга АНУФРЫЕВА.

Сядзі і глядзі

ЛЁС ПЕРАМОЖЦЫ Ў НАШЫХ РУКАХ

Пяць фіналістаў шоу «X-Factor» 18 снежня будуць спяваць для галоўных людзей у жыцці — для сваіх бацькоў. Чарговы пяты прамы эфір убачым на «Беларусь 1» у 20.45.

У мінулую суботу тэлеаўдыторыі прадставілі канцэрт, які складаўся з кампазіцый легендарнага беларускага ВІА «Песняры», аднак разам з тым, па выніках галасавання гледачоў шоу пакінулі Карына Ярафеева і Яўген Вярэніч. Маладыя артысты паспелі яркімі выступленнямі ўпісаць свае імёны ў гісторыю талент-шоу. І яно набліжаецца да фіналу. Тым часам актыўна ідзе падрыхтоўка да чарговага прамога эфіру: удзельнікі разам з настаўнікамі, педагогамі і харэографамі працуюць над пастаноўкай новых нумароў. Па выніках гэтага канцэрта стануць вядомыя імёны тых, хто 25 снежня будзе змагацца за пераможныя лаўры першага сезона шоу і атрымае ў якасці прыза аўтамабіль Geely. Таксама спецыяльны падарунак для пераможцы рыхтуе і генеральны прадзюсарскі цэнтр Беларускага радыё.

А значыць, не шкадуйце часу, каб падтрымаць сваіх любімых выканаўцаў. Нагадаем, зрабіць гэта можна, патэлефанаваўшы пасля выступленняў усіх удзельнікаў у прамым эфіры па тэлефоне 8 810 10 10 6 XX, дзе дзве апошнія лічбы — нумар канкурсанта, альбо адправіўшы СМС-паведамленне з гэтымі ж звесткамі на кароткі нумар 2885. Калі ж не паспелі прагледзець папярэднія выступленні ўдзельнікаў шоу, то яны чакаюць вас на афіцыйным YouTube-канале шоу. Больш падрабязнасцяў шукайце таксама ў сацыяльных сетках «X-Factor у Беларусі».

Алена ДРАПКО.

Каляндныя месы ў тэлеэфіры

Да свята Нараджэння Хрыстова па календары каталіцкай канфесіі ў эфіры тэлеканалаў Белтэлерадыёкампаніі 24 і 25 снежня пройдуць прамыя трансляцыі богаслужэнняў з Мінска і Ватыкана.

Напярэдадні Раства канал «Беларусь 1» у 21:45 распачне прамую трансляцыю службы са сталічнага Архікафедральнага касцёла Найсвяцейшай Дзевы Марыі. Узначаліць месу іерарх каталіцкай царквы ў Беларусі, архіепіскап-мітрапаліт Мінска-Магілёўскі Юзаф Станеўскі. Пасля ў 23:45 тэлеканал у рэжыме рэальнага часу пакажа калядную месу з Ватыкана з удзелам Папы Рымскага Францыска.

Святочнай раніцай 25 снежня ў 07:50 са Словам да вернікаў звернецца архіепіскап Юзаф Станеўскі. Працягнецца эфір калядны-мі выпускамі праграмы «Існасць». А паслан-не і бласлаўленне Папы Францыска «Граду і свету» пакажа тэлеканал «Беларусь 3» у 18:05.

Алена ДРАПКО.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 135

Сённяшняя задача, якую ў свой час склалі знакамітыя савецкія шахматныя кампазітары Якаў Уладзіміраў і Аляксандр Грын, выяўленчая і называецца «Лыжы» ***(гл. дыяграму)***. Як-ніяк зараз зіма. А да навагодняй тэматыкі мы звернемся ў наступным выпуску.

Белыя: Крb4, Лd2, Сf3, Ch4, пп. d3, d7, f2 (7).

Чорныя: Крd4, Кd6, Kf7, пп. d5, f4, f5, f6 (7).

Мат за 2 хады.

Прапануем чытачам гэтую задачу для самастойнага рашэння. Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У Дубаі завяршыўся матч за сусветную карону. Нарвежац Магнус Карлсен выйграў у расіяніна Яна Няпомняшчага чатыры партыі пры сямі нічыіх і пяты раз заваяваў найвышэйшы тытул.

Магнус Карлсен — Ян Няпомняшчы (8-я партыя). 1. e4 e5 2. Kf3 Kf6 3. d4 K:e4 4. Cd3 d5 5. K:e5 Kd7 6. K:d7 C:d7 7. Kd2 K:d2 8. C:d2 Cd6 9. 0-0 h5 10. Фe1+ Крf8 11. Cb4 Фe7 12. C:d6 Ф:d6 13. Фd2 Лe8 14. Лae1 Лh6 15. Фg5 c6 16. Л:e8+ C:e8 17. Лe1 Фf6 18. Фe3 Cd7 19. h3 h4 20. c4 dc 21. C:c4 b5 22. Фa3+ Крg8 23. Ф:a7 Фd8 24. Cb3 Лd6 25. Лe4 Ce6 26. C:e6 Л:e6 27. Л:e6 fe 28. Фc5 Фa5 29. Ф:c6 Фe1+ 30. Крh2 Ф:f2 31. Ф:e6+ Крh7 32. Фe4+ Крg8 33. b3 Ф:a2 34. Фe8+ Крh7 35. Ф:b5 Фf2 36. Фe5 Фb2 37. Фe4+ Крg8 38. Фd3 Фf2 39. Фc3 Фf4+ 40. Крg1 Крh7 41. Фd3+ g6 42. Фd1 Фe3+ 43. Крh1 g5 44. d5 g4 45. hg h3 46. Фf3, 1:0.

Ян Няпомняшчы — Магнус Карлсен (9-я партыя). 1. c4 e6 2. g3 d5 3. Cg2 d4 4. Kf3 Kc6 5. 0-0 Cc5 6. d3 Kf6 7. Kbd2 a5 8. Kb3 Ce7 9. e3 de 10. C:e3 Kg4 11. Cc5 0-0 12. d4 a4 13. C:e7 Ф:e7 14. Kc5 a3 15. ba Лd8 16. Kb3 Kf6 17. Лe1 Ф:a3 18. Фe2 h6 19. h4 Cd7 20. Ke5 Ce8 21. Фe3 Фb4 22. Лeb1 K:e5 23. de Kg4 24. Фe1 Ф:e1+ 25. Л:e1 h5 26. C:b7 Лa4 27. c5 c6 28. f3 Kh6 29. Лe4 Лa7 30. Лb4 Лb8 31. a4 Лa:b7 32. Лb6 Л:b6 33. cb Л:b6 34. Kc5 Kf5 35. a5 Лb8 36. a6 K:g3 37. Ka4 c5 38. a7 Лd8 39. K:c5 Лa8, 0:1.

Ян Няпомняшчы — Магнус Карлсен (11-я партыя). 1. e4 e5 2. Kf3 Kc6 3. Cc4 Kf6 4. d3 Cc5 5. c3 d6 6. 0-0 a5 7. Лe1 Ca7 8. Ka3 h6 9. Kc2 0-0 10. Ce3 C:e3 11. K:e3 Лe8 12. a4 Ce6 13. C:e6 Л:e6 14. Фb3 b6 15. Лad1 Ke7 16. h3 Фd7 17. Kh2 Лd8 18. Khg4 K:g4 19. hg d5 20. d4 ed 21. ed Лe4 22. Фc2 Лf4 23. g3 de 24. gf Ф:g4+ 25. Крf1 Фh3+ 26. Крg1 Kf5 27. d6 Kh4 28. fe Фg3+ 29. Крf1 Kf3 30. Фf2 Фh3+ 31. Фg2 Ф:g2+ 32. Кр:g2 K:e1+ 33. Л:e1 Л:d6 34. Крf3 Лd2 35. Лb1 g6 36. b4 ab 37. Л:b4 Лa2 38. Крe4 h5 39. Крd5 Лc2 40. Лb3 h4 41. Крc6 h3 42. Кр:c7 h2 43. Лb1 Л:c3+ 44. Кр:b6 Лb3+ 45. Л:b3 h1Ф 46. a5 Фe4 47. Крa7 Фe7+ 48. Крa8 Крg7 49. Лb6 Фc5, 0:1.

* * *

Новым кіраўніком Беларускай федэрацыі шахмат абраны Сяргей Сяргеевіч Сычук, начальнік аддзела кадраў «Белавія».

У чэмпіянаце Гродзенскай вобласці прызавую тройку склалі Сяргей Жук, Андрэй Альховік і Андрэй Малюш, сярод жанчын перамагла Ганна Сямёнава. У чэмпіянаце Гомельскай вобласці прызёрамі сталі Платон Клачкоў, Раман Леінаў і Канстанцін Куляшоў, сярод жанчын найлепшая Злата Данчанка. У чэмпіянаце Магілёўскай вобласці тры першыя месцы занялі адпаведна Сяргей Міхайлоўскі, Сяргей Вашчылаў і Уладзімір Голубеў, сярод жанчын найлепшая Кацярына Галоўчык. У чэмпіянаце Мінска прызавую тройку склалі Павел Мухін, Аляксей Краміч і Віталь Валянук, сярод жанчын — Рэната Аюшава, Ксенія Зелянцова і Марыя Дубовік.

У анлайн-турніры на сайце chess.com (509 удзельнікаў) Сяргей Жыгалка заняў 5-е месца, Сяргей Азараў — 25-е, Уладзіслаў Кавалёў — 37-е.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца 1. f8K (1. f8Ф? Kd4!). Першыя правільна адказалі Міхаіл Кошаль, Васіль Жуковіч, Фёдар Карпей, Ігар Ананіч, Сяргей Цяльпук, Віктар Жук.

Вадзім ЖЫЛКО.

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Самае цікавае ў снежаньскім нумары часопіса «Алеся»

Свежае паветра і галаваломкі

Як аднаўляць арганізм пасля COVID-19? Пра тое, як правільна арганізаваць перыяд аднаўлення і рэабілітацыі, чытачам «Алесі» расказвае ўрач па медыцынскай прафілактыцы Ганна Родзіч. Яна раіць найперш аднаўляць фізічную актыўнасць, аднак рабіць гэта паступова. І чытаць трэба як мага больш — гэта дапаможа аднаўленню функцый галаўнога мозга...

Шчадрую, шчадрую, каўбасу чую!

Набліжаецца час святкавання Божага Нараджэння і Каляд. Цэлы тыдзень даўней беларусы хадзілі адно да аднаго ў госці — шчадравалі-калядавалі. Пра традыцыі нашых продкаў расказвае этнограф Ларыса Мятлеўская.

Прыгожая ўсмешка на марозе

«Алеся» расказвае асноўныя правілы зімовага догляду за самай неабароненай часткай нашага твару. Што рабіць, каб вусны зімой не перасыхалі? Парады і рэцэпты вы знойдзеце ў снежаньскім часопісе.

Які колер выбірае Тыгр?

У колеравай гаме наступнага года мусяць пераважаць такія адценні: зялёны/золата/шампань ці срэбра/блакітны/сіні. Актуальнае будзе таксама спалучэнне жоўтага, карычневага і бэжавага. Або бі-руза/слановая косць/шэры — увасабленне спакою і пяшчоты. Белы/срэбны/сіні — стрыманая класіка.

У чым сустракаць Новы год? Асноўнае правіла — больш натуральнага і нейтральнага, менш яркага і пампезнага. Далікатная элегантнасць — вось дэвіз і надыходзячага свята, і будучага года.

«Са "Звяздой" цяплей»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на I квартал або I паўгоддзе 2022 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 16 студзеня 2022 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Сярод падпісчыкаў будуць разыграны 7 тэрмасаў універсальных для ежы і напояў ARIZONE і суперпрыз — электрасамавар Kelli. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 29 студзеня 2022 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31 сакавіка 2022 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на I квартал або I паўгоддзе 2022 года і пашпарта. Пасля 31 сакавіка выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Звязда» чытайце ў нумары 235 газеты «Звязда» ад 4 снежня 2021 года.

Тэлефоны для даведак: (017) 271 81 53, 311 17 40.
Тэрмін правядзення гульні — 7—31 снежня 2021 года.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4117 ад 30.11.2020 года выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або I паўгоддзе 2022 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска аформлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)
на I квартал або I паўгоддзе 2022 года

Жатні адрас і тэлефон _____ _____
(абавязкова) *(індэкс)*

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15 Зона Х (16+).
9.10 Галоўны эфір.
10.40, 12.10, 19.20, 22.00 Драма «А ў нас у двары...» (16+)
13.05, 15.25 Драма «Старэйшая жонка» (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Драма «Халодныя берагі» (16+).
18.35 Фільм «Незабыты подзвіг» (12+).
20.30 «Спецфронт». Дак. фільм (12+).
21.00 Панарама.
21.45 Зразумелая палітыка.
23.15 Серыял «След» (16+).
1.00 Арэна.
1.25 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 11.05, 21.05 Тэлебарометр.
9.05, 19.55 «Зразумець. Прабачыць» (16+).
10.15 «На тыдзень» (16+).
11.40 Анімацыйны серыял «Стыч!» (6+)
12.20 Анімацыйны фільм «Фердынанд» (6+).
14.10 «Усёй сям'ёй» (6+).
15.05 Камедыя «Паедзем да чортавай бабулі!» (12+)
16.55 «Тры першыя спатканні» (16+).
17.45 «Багіня шопінгу. Экстрэмальны сезон» (16+).
18.45 «На кручку» (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
21.20 Серыял «Жаночы доктар-4» (16+).
22.25 Серыял «Браты па крыві-2» 16+).
0.20 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня». Перапечкі і чукуляда.
8.05, 12.00, 19.40, 23.05 Навіны культуры.
8.25 «Нацыянальны хіт-парад».
9.20, 21.05 «Вялікае кіно. «Піраты XX стагоддзя». Дак. фільм (12+) [СЦ].
9.50, 21.35 «Піраты XX стагоддзя». Маст. фільм (12+) [СЦ].
11.15, 17.35 «Арктыка». Дак. фільм (12+).
12.20 «Беларуская кухня». Свініна, тушаная з капустай.
12.50 «Наперад у мінулае».
13.25 «Навукаманія» (6+).
13.50 «Тры талеры». Маст. фільм (6+) [СЦ].
18.25 Святочны канцэрт да 130-годдзя з дня нараджэння М. Багдановіча.
20.00 «Люблю і памятаю».
20.40 «Калыханка» (0+).
23.20 «Камертон».

Беларусь 5

7.00 Азбука спорту.
7.15, 16.55 Плаванне. Чэмпіянат свету на кароткай вадзе.
9.35 Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
10.35, 13.15 Гандбол. Чэмпіянат свету. Жанчыны.
12.15 Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
14.55 Валейбол. Кубак Беларусі. Мужчыны.
19.10 Спорт-цэнтр.
19.20 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
20.20 Хакей. КХЛ. «Дынама» (Рыга) — «Дынама-Мінск».
22.50 Фігурнае катанне. Адкрыты чэмпіянат Беларусі.

АНТ

6.00, 7.10, 8.10 «Наша раніца».
6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30, 0.15** Нашы навіны.
9.10 Контуры.
10.10 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Модны прыгавор» (6+).
12.20 «Асаблівасці нацыянальнай работы» (12+).
13.15, 22.45 Серыял «Патрэбен мужчына» (16+).
15.00 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.50 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 Час.
21.15 «Прапаганда» (16+).
21.35 Серыял «Знахар» (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны» [СЦ].
8.40 «Тыдзень».
10.40, 0.05 «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
11.35 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.35, 21.00 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.20 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.35, 16.50 «Глухар». Серыял (12+).
18.30 «Па сутнасці».
20.30, 23.15 «СТБ-спорт».
20.35 «Сталічныя падрабязнасці».
20.45 «Міншчына».
22.00 «Скардзіцца дазваляецца».
0.45 «Самая карысная праграма» (16+).
1.35 «Мінтранс» (16+).

МІР

5.00 Мастацкі фільм «Першая пальчатка» (0+).
6.00 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
6.25, 10.20 Серыял «Шчыт і меч» (12+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 3.00, 4.00 Навіны (бягучы радок).
10.10 «Беларускі стандарт» (12+).
13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10, 16.20, 18.05 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
17.10 «Міравое пагадненне» (16+).
19.25 «Гульня ў кіно» (12+).
20.10 «Слабае звяно» (12+).
21.05 «Назад у будучыню» (16+).
21.55 Серыял «Даішнікі-2» (12+).
1.45 «Разам».
2.45, 4.15 «Мір. Меркаванне» (12+).
3.15 «Культ асобы» (12+).
3.25 «Зроблена ў Еўразіі» (12+).
3.35 «5 прычын застацца дома» (12+).
3.45 «Нашы замежнікі» (12+).
3.55, 4.30 Спецыяльны рэпартаж (12+).
4.40 Мастацкі фільм «Вясна» (12+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Тайны Беларусі» (16+).
12.45 «У людзях».
13.35 «Плюс-мінус».
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 «60 хвілін» (12+).
15.55, 17.15 Серыял «Кулагіны» (16+).
18.35 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
21.05 Серыял «Таямніцы следства — 21» (16+).
23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05 «Здароўе» (12+).
7.00 «Маршрут пабудаваны» (12+).
7.40 Будучыня сёння (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.25, 10.25 Серыял «Ціхі цэнтр» (12+).
13.25 Надзвычайнае здарэнне.
13.50 «За гранню» (16+).
14.45 «ДНК» (16+).
16.40, 19.50, 22.20, 23.40 Сёння. Галоўнае.
16.45 Дэтэктыў «Пёс» (16+).
20.05 Серыял «Былых не бывае» (16+).
22.25 «НЗ.by».
22.45 «Заснавана на рэальных падзеях» (16+).

8 канал

7.00, 14.25, 17.45, 21.00, 1.00 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад. «Фарсаж. Гоншчыкі» (6+).
7.30, 14.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Фільм «Ледзяная дрыготка» (12+).
9.05 Серыял «Новая Гвінея».
9.50 Фільм «Містар Джангл і каляднае падарожжа» (12+).
11.50 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).
12.40 Серыял «Спакуса» (16+).
14.35 Мультпарад. «Таямніца зімовага лесу».
15.40 «Хачу ў Парыж» (12+).
15.50 Серыял «Палдарк» (16+).
17.50 Камедыя «Сардэчна запрашаем, або Суседзям уваход забаронены» (12+).
19.25 Серыял «Добры доктар» (16+).
20.55 «Вечарніца» (0+).
21.05 Драма «Шчаслівага Растава» (16+).
23.00 Камедыя «Марлі і я» (12+).

ВТВ

6.05 «Раніца з гумарам». Дайджэст (16+).
8.05 «Дурні і дарогі» (16+).
9.00 М/ф «Пацяшоба» (0+).
9.20 М/ф «Тры каты» (0+).
9.45 М/ф «Лекс і Плу» (6+).
10.15 Анімацыйны фільм «Пушыстыя супраць зубатых» (12+).
12.00 «Галерэя прыгажосці» (16+).
12.50 «Селапаляцела» (16+).
13.50 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
14.15, 1.40 «Проста кухня» (16+).
14.45 «Рускія не смяюцца» (16+).
15.50 «Уральскія пельмені». Людзі Ікс Эль (16+).
17.25, 20.00 Серыял «Кухня» (16+).
22.35 «Наш рамонт» (16+).
23.10 «Велабайкі» (16+).
23.50 «Кіно ў дэталях» (16+).
0.45 «Рогаў у справе» (16+).
2.10 Серыял «Татавы дочкі» (12+).
3.20 «Даеш моладзь» (16+).
5.00 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30 «Загадкавая планета», «Пластылінавая варона», «Брэменскія музыканты», «Па слядах брэменскіх музыкантаў», «Вяртанне блуднага папугая». М/ф.
8.15 «Вашы правы?» Маст. фільм [СЦ].
9.55 «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
10.25 Да 100-годдзя з дня нараджэння Сяргея Коласава. «Душачка». Маст. фільм [СЦ].
11.40 «Сяргей Коласаў. Дакументальнасць легенды». Дак. фільм [СЦ].
12.35 Лісты з правінцыі. Светлагорск (Калінінградская вобласць) [СЦ].
13.05, 2.00 «Дзікая прырода акіянаў». Дак. фільм [СЦ]
14.00 «Саюзмультфільм — 85». Дак. серыял (Расія, 2021) [СЦ].
14.25 Неўскі каўчэг. Тэорыя немагчымага. Генрых Шліман.
14.55 «Тагефон, або Смерць «вялікага нямога». Дак. фільм [СЦ].
15.35 Ілюзіён. Паляванне на ведзьмаў. «Гэта павінна здарыцца з вамі». Маст. фільм.
17.15 «Пешшу. Пра вайну і мір». Дарога жыцця [СЦ].
17.45 «Магутны мсціўца злых крыўдаў». Дак. фільм [СЦ].
18.35 «Рамантыка рамансаў».
19.30 Навіны культуры.
20.10 «Нам некуды бегчы адно ад аднаго...» Маст. фільм.
21.40 «Безыменная зорка». Маст. фільм [СЦ].
23.55 «Кінескоп».
0.35 «Жаніцьба Бальзамінава». Маст. фільм [СЦ].

Настальгія

6.10 «Да і пасля...» (16+)
6.55, 8.30, 9.40, 11.40, 13.30, 19.55, 0.40, 3.40, 5.00 Музычная настальгія (12+).
7.10 Маст. фільм «Адзінокая жанчына жадае пазнаёміцца» (16+).
9.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00 «Колба часу» (16+).
11.00, 17.20, 23.10, 5.25 «Блеф-клуб» (16+).
12.00 Маст. фільм «Юнацтва Максіма» (12+).
13.40 «Музычная гавань Элеаноры Філіпай» (16+).
15.00 «Быў час» (16+).
16.00 Маст. фільм «Калі можаш, прабач...» (16+)
18.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (16+).
18.50 Маст. фільм «Па вуліцах камоду вадзілі» (16+).
21.45 Маст. фільм «Інспектар крымінальнага вышуку» (18+).
0.00 «Эліта Краіны Савета» (12+).
0.55 Маст. фільм «Паветраныя піраты» (18+).
2.15 «Рок-н-рол ТБ» (16+).

EuroSport 1

0.00 Веласпорт. Amstel Gold. Мужчыны (16+).
1.00 Веласпорт. «Льеж — Бастонь — Льеж». Мужчыны (16+).
2.00 Тэніс. «Ралан Гарос». Жанчыны (6+).
3.30 Тэніс. «Ралан Гарос». Мужчыны (6+).
5.00, 23.25 Веласпорт. ЧС. Мужчыны (16+).
6.00, 16.40 Веласпорт. «Парыж — Рубэ». Мужчыны (16+).
7.00 Веласпорт. Тур Ламбардыі. Мужчыны (16+).
8.00 Тэніс. US Open. Жанчыны (6+).
9.30, 18.15 Тэніс. US Open. Агляд (6+).
10.30, 20.20 Скачкі на лыжах з трамплінаў. КС. Мужчыны (16+).
11.15, 12.00, 12.45, 21.05, 21.50, 22.35 Скачкі на лыжах з трамплінаў. КС (16+).
13.30 Веласпорт. ЧС. Жанчыны (16+).
14.15 Веласпорт. «Парыж — Рубэ». Жанчыны (16+).
15.35 Велакрос. КС. Жанчыны.
17.00 Велакрос. КС. Мужчыны.
19.15 Тэніс. Кубак Лэйвера (6+).
20.15, 23.20 Навіны (16+).

Кінакамедыя

0.55 Хлопец з нашых могілак (12+).
3.10 Пачатак часоў (16+).
4.55 Укол парасонам (16+).
6.45 Прасунуты (16+).
8.20 Спявак на вяселлі (12+).
10.10 Лаві момант (16+).
11.35 Любоў да сабак абавязковая (16+).
— Штучную ёлку вы набываеце раз на 8—10 гадоў, таму выбіраць яе трэба сур'ёзна і адказна: гэтак жа, як любую іншую буйную пакупку ў дом, — кажуць прадаўцы. — Штучныя ёлкі — эканамічна выгадна. Часцей за ўсё вытворца дае гарантыю на штучную ёлку на 10 гадоў, але якасны выраб праслужыць даўжэй. А натуральная ёлка — гэта выдаткі штогод. Вось і лічыце. Да таго ж вы эканоміце сілы і час — проста дасталі і паставілі...

Выбіраць штучную ёлку трэба па правілах, гавораць прадаўцы. Перш за ўсё панюхаць: выраб не павінен мець ніякага паху. «Водар» гумы ці пластыку сведчыць аб нізкай якасці вырабу. Пагладзьце ялінку «супраць шэрсткі»: іголкі павінны «сядзець» на галінцы трывала, у руцэ не заставацца. Калі паміж ігліцай заўважны дрот, значыць, выраб няякасны. І, самае галоўнае, ёлка павінна быць пажарабяспечная, сама па сабе вогнетрывалая або апрацавана вогнетрывалым саставам. Гэты аспект лепш удакладніць у прадаўца. Менавіта таму не варта эканоміць на якасці штучнай ёлкі. Па-першае, танны выраб калі і дажыве да наступнага Новага года, хутка страціць выгляд. А па-другое, якасная штучная ёлка «застрахаваная» ад выпадковага ўзгарання, адзначаюць прадаўцы.

З чаго ж робяць штучныя ёлкі? Часцей за ўсё сучасныя аналагі жывых зімовых прыгажунь вырабляюць з ПВХ (гэта пластмасавы палімер). Дарэчы, ПВХ увогуле не гарыць на адкрытым паветры, і гэта вялізны плюс. Акрамя таго, матэрыял не мае паху, гіпаалергенны, і ігліца з ПВХ не колецца. Так што бацькі маленькіх дзяцей, як і гаспадары хатніх жывёл, могуць з гэтай нагоды не хвалявацца. Па тэхналогіі вытворчасці ёлкі бываюць некалькіх відаў. Першы і самы распаўсюджаны — так званыя літыя: ігліцу адліваюць у спецыяльных формах, а потым ялінку збіраюць з адлітых галінак. Такія ёлкі выглядаюць зусім як натуральныя, вельмі прыгожыя дрэўцы, праслужаць 10 і больш гадоў і могуць быць любых памераў. Звычайна іх выпускаюць у памернай сетцы ад 140 да 300 см. Яшчэ адзін тып штучных ялінак — дрэўцы, зробленыя з ПВХ-плёнкі. Яны абыдуцца пакупніку танней, але ігліца ў іх мякчэйшая, чым у літых. А значыць, яны менш даўгавечныя, затое важаць менш і займаюць мінімум месца ў запакаваным выглядзе. Штучныя сосны часам робяць з лёскі — яны вельмі пышныя і самыя даўгавечныя (праслужаць не менш за 15 гадоў), але даволі калючыя.

Яшчэ адзін выгляд штучных ёлак — з сумесі літых галінак і ігліцы з плёнкі. Пакольк літая штучная ігліца — самы дарагі від, гэты момант таксама варта ўдакладніць у прадаўца. На вока адрозніць цалкам літую ігліцу ад сумесі атрымліваецца не заўсёды. У асартыменце да Новага года і дызайнерскія ёлкі — з сумесі натуральных і штучных матэрыялаў. Іх лепш шукаць на сайтах рамеснікаў.

І, нарэшце, ёлкі адрозніваюцца па дэкоры. Ёсць са штучным напыленнем, якое імітуе снег. Ёсць блакітныя ёлкі, якія ўвасабляюць прыродны аналаг. Часам штучныя ёлкі ўпрыгожваюць сапраўднымі шышкамі, апрацаванымі лакам ці фарбай для даўгавечнасці. Прапаноўваюцца і зусім белыя ялінкі для аматараў стыльных інтэр'ераў. Дарэчы, менавіта белы — адзін з колеравых фаварытаў Тыгра, апекуна наступнага года. Упрыгожваць белую ёлку сёлета астролагі рэкамендуюць таксама белымі цацкамі розных фактур і адценняў.

Пухнатыя ёлачныя цацкі зараз у модзе.

Цяпер па цэнах. У буйных універмагах сталіцы яны пачынаюцца ад 57—60 рублёў і даходзяць амаль да 1400. Самая дарагая ёлка ў ГУМе каштуе 1336 рублёў 50 капеек. Яе вышыня 210 см, зроблена ў Беларусі. Выглядае сапраўды эфектна. На пышнай ігліцы — напыленне, якое імітуе снег.

Але ГУМ — гэта «па-багатаму». Калі трэба танней, можна адправіцца ў навагоднія аддзелы буйных рытэйлаў. Там цэны на штучныя ёлкі пачынаюцца з 15 рублёў (дрэўца крыху вышэй за паўметра), а двухметровая ёлка каштуе да 500 рублёў. На Камароўцы штучную паўтараметровую ялінку можна старгаваць за 135—140 рублёў. А ў краме «Фікспрайс» са штучнай ёлкай і поўным наборам яе ўпрыгожванняў рэальна ўкласціся ў 30 рублёў.

Каб штучная ёлка гарантавана мела таварны выгляд абяцаныя вытворцам 10 гадоў, яе важна правільна захоўваць. Прадаўцы адзначаюць, што ад свята да наступнага яе лепш спакаваць у поліэтылен або пластыкавы мяшок і змацаваць герметычны скрутак ліпкай стужкай. Перад тым як адправіць ёлку на захоўванне, галінкі трэба працерці вільготнай анучкай. Месца для ялінкі важна знайсці не вельмі цёплае, без перападаў тэмператур.

ЧЫМ УПРЫГОЖВАЦЬ?

Разабраўшыся з ёлкай, задумаемся аб яе ўпрыгожванні. І — таксама свайго роду навагодняя традыцыя — зверымся ў гэтым пытанні з усходнім календаром. Надыходзячы год будзе годам Чорнага (Блакітнага) Вадзянога Тыгра. Яго колеры — сіні і белы, залаты і срэбны, жамчужна-шэры і, зразумела, чорны. А вось яркія колеры арыстакратычны Тыгр недалюблівае: чырвоны, аранжавы і фіялетавы могуць быць толькі ў якасці дробных акцэнтаў.

Не ведаю, ці звязана гэта з усходнім гараскопам, але сёлета вельмі шмат ёлачных цацак белага колеру і светлых нюдавых тонаў. Фактуры, памеры і формы самыя розныя, а вось колеравая гама ў асноўным светлая. Сёлета мода на пухнатыя ёлачныя цацкі — з варсінкамі, пёркамі і нават з мехам. Выглядаюць яны сапраўды выдатна і вельмі прыемныя навобмацак. Яркіх чырвоных і фіялетавых ёлачных цацак не так шмат, як у мінулыя гады. Сіняя гама прысутнічае ў вялікай колькасці. А вось чорных заўважана не было. З іншага боку, нягледзячы на колер апекуна надыходзячага года, наўрад ці знойдзецца шмат ахвотных упрыгожыць сваю хату «гатычнай» ёлкай з чорнымі цацкамі.

Як і ў выпадку з ёлкамі, вытворчасць ёлачных цацак і ўпрыгожванняў у асноўным айчынная і кітайская. Што да цэн, то ў навагодніх аддзелах універмагаў наборы пластыкавых шарыкаў можна купіць ад 5 рублёў, у сярэднім цэнавы дыяпазон — 7—14 рублёў. Фігуркі, зразумела, даражэйшыя за шарыкі: за адну ў асобнай скрынцы пачцы прыйдзецца выкласці рублёў 13—17. Пухнатыя шарыкі прадаюцца паштучна за 7—9 рублёў. А цацкі-совы ці птушкі-прышчэпкі, таксама пухнатыя, будуць каштаваць аж 20—27 рублёў за штуку. Шкло традыцыйна даражэйшае за пластык. Тут цэны на іх пачынаюцца ад 8—10 рублёў і могуць узняцца дастаткова высока — да 45 рублёў за набор настальгічных шкляных цацак, нібы з савецкага дзяцінства.

— Шкло не такое папулярнае, як пластыкавыя цацкі, якія не б'юцца, — распавяла прадавец. — Калі ў сям'і маленькія дзеці, няма рызыкі атрымання траўмы. Акрамя таго, яны лёгкія — наўрад ці адлучацца ад мацавання і ўпадуць з ёлкі. Ды і з крамы дахаты давезці іх прасцей, чым далікатныя шкляныя. Але ёсць і аматары шкляных цацак. Бо ўпрыгожванні са шкла выглядаюць больш эфектна, блікі на іх ярчэйшыя, да таго ж яны падобныя на тыя цацкі, якімі ўсе мы ўпрыгожвалі ёлку ў дзяцінстве.

Па мішуру (ад 3 да 5 рублёў за ўпакоўку) і светлавыя гірлянды (ад 7 рублёў) лепш пад'ехаць на буйныя рынкі — там ужо разгарнуўся бойкі гандаль з «навагоднім настроем». На Камароўцы прапаноўваецца таксама шырокі асартымент хлапушак.

Куды адправіцца на атмасферу свята — пытанне залежыць ад сумы, з якой вы гатовы расстацца. Але пры куплі ёлачных цацак на рынках і — асабліва! — на прыпынках і каля прадуктовых крам, дзе пад Новы год з'яўляюцца сталы з навагодняй атрыбутыкай, важна звярнуць увагу на іх якасць. Няякасныя ёлачныя цацкі могуць змяшчаць таксічныя рэчывы. Важна праверыць элемент мацавання, адсутнасць якіх-небудзь хімічных пахаў і якасць фарбавальніка (для гэтага акуратна патрыце цацку сурвэткай: калі на ёй засталіся сляды фарбы, адмоўцеся ад пакупкі). Магутнасць гірлянды для інтэр'еру дома або кватэры не павінна перавышаць 50 Вт, для вуліцы — 60 Вт. Калі магутнасць вышэйшая, можа ўзнікнуць перагрэў, што небяспечна пажарам.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

❍ Дарэчы

«СТРАТЭГІЧНЫЯ» ПРАДУКТЫ

Дзеля якаснага абслугоўвання насельніцтва ў святочныя і перадсвяточныя дні краіна рыхтуецца загадзя па ўсіх напрамках, запэўніваюць эксперты галіны: пачынаючы ад упрыгожвання аб'ектаў харчавання і гандлю (з 26 лістапада да 4 снежня) і завяршаючы падаўжэннем тэрмінаў іх работы (каля 270 гандлёвых аб'ектаў і 160 — харчавання ў Беларусі цяпер працуе пазней, чым звычайна), скасаваннем перапынкаў на абед і выхадных дзён, недапушчэннем закрыцця ўстаноў на рамонт і пераўлік.

Перадсвяточныя банкеты ў залежнасці ад месца і складу меню абыдуцца ад 25 да 140 рублёў на чалавека, а ў навагоднюю ноч — ад 35 да 180 рублёў, што раўназначна кошту леташніх банкетаў, падзяліліся ва ўпраўленні арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю (МАРГ).

«Стратэгічны» харчовы святочны асартымент беларусаў, згодна з попытам спажыўцоў, гэта свежая садавіна і гародніна, ікра, рыба і морапрадукты, каўбасы, вэнджаніна, абавязковы кансерваваны зялёны гарошак, шампанскае і шакалад. Усе гэтыя пазіцыі задавальняе айчынны вытворца, сведчаць у МАРГ. А па некаторых пазіцыях з улікам акцый назіраецца нават зніжэнне цаны.

На навагодні стол беларусам прапануецца ажно 40 найменняў айчыннага шампанскага і пеністага віна коштам ад 6,39 рубля да 16 рублёў за бутэльку 0,75 літра. А на вулічных пляцоўках сталічныя кулінары і кандытары збіраюцца частаваць насельніцтва аладкамі з начынкамі, дранікамі, гарачым шакаладам, глінтвейнам, смажанымі смаўжамі, шашлыкамі на мангале, мясам у тандыры ды іншымі прысмакамі.

Ірына СІДАРОК.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Добрушского районного потребительского общества (продавец) в лице ликвидатора – Беланова Р.Н. извещает о проведении 28 декабря 2021 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 60 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
1	**Капитальное строение с инв. № 311/С-48613** площадью **807,7 кв. м**, назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – **ресторан «Ипуть». Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Кооперативная, 1. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321250100001002941,** общая площадь **0,1305 га (право постоянного пользования). В состав лота №1 входит 17 единиц оборудования, в том числе:** кондиционер BALLU BSC-24H, кондиционер BALLU MUB 60HR, машина тестомесильная MTM-65M, плита электрическая, шкаф жарочный, шкаф жарочный ШПЭСМ-3М, холодильник МХМ1818, холодильник МХМ 1804-33, тестомесильная машина МТМ-60, сигнализация, мясорубка МИМ-300М, стол для приготовления пиццы РТ920, холодильник ШВУ 0.4-1.3-0.7 «Атлант», холодильный агрегат к холодильнику, холодильный агрегат к холодильнику UJ2178, кондиционер SAMSUNG, холодильник MXM 1609	**103 118,40**	10 311,84

Продавец: Добрушское районное потребительское общество, г. п. Тереховка, ул. Вокзальная, 47.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (044) 590-84-01, Валентина Александровна.**

Шаг аукционных торгов – 5 (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB30120400071204001001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**.

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 17 декабря 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 24 декабря 2021 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно срокам заключенного договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 21.09.2021 г. № 181 (29550).

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: тел./факс 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16.

Извещение о проведении 06 января 2022 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

Предмет торгов

Капитальное строение с инв. номером 630/С-47149 общей площадью 647,0 кв. м (наименование – административное здание; назначение – здание административно-хозяйственное; составные части и принадлежности: бетонный подвал); капитальное строение с инв. номером 630/С-47154 общей площадью 397,2 кв. м (наименование – склад материальный; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-47152 общей площадью 222,7 кв. м (наименование – склад для горюче-смазочных материалов; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-47155 общей площадью 743,1 кв. м (наименование – боксы для автомашин с пристройкой подсобных помещений; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47160 общей площадью 1960,9 кв. м (наименование – ремонтные мастерские; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47158 общей площадью 1360,7 кв. м (наименование – пристройка к реммастерским; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47156 общей площадью 1123,1 кв. м (наименование – боксы для автомашин; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-55558 общей площадью 35,0 кв. м (наименование – навес под баллоны; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-55622 (наименование – ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение из силикатного кирпича (1,95 м х 2,34 м х 0,25 м), площадью 4,6 кв. м); капитальное строение с инв. номером 630/С-55620 (наименование – ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение из металлической арматуры (21,0 м х 2,69 м), площадью 56,5 кв. м, на металлических столбах (0,1 м х 2,60 м)); капитальное строение с инв. номером 630/С-55611 (наименование – ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1.1. – ограждение из силикатного кирпича (13,94 м х 2,85 м х 0,25 м), 39,7 кв. м, а1.2. – ворота металлические (4,07 м х 2,85 м)); капитальное строение с инв. номером 630/С-55610 (наименование – ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение бетонное (97,5 м х 1,71 м), 166,7 кв. м с 31 кирпичными столбиками с бетонными оголовками; а.1.1. – металлическая решетка (1,50 м х 1,97 м), 41,37 кв. м; а2 – ворота металлические (5,96 м х 3,70 м), 22,1 кв. м; а2.1. – калитка металлическая (1,62 м х 2,30 м), 3,73 кв. м); капитальное строение с инв. номером 630/С-55608 общей площадью 7260,0 кв. м (наименование – площадка; назначение – сооружение неустановленного назначения; составные части и принадлежности: а1 – площадка из асфальтобетона); капитальное строение с инв. номером 630/С-55607 общей площадью 465,0 кв. м (наименование – площадка; назначение – сооружение неустановленного назначения; составные части и принадлежности: а1 – площадка из бетонной плитки); оборудование котельной с инв. номером 146 (котел КВЖ-02, 2 шт.; циркуляционный насос, 4 шт.; бойлер 10 куб. м, 1 шт.; топливопровод 20 м; щит управления)

Сведения о земельном участке: площадь – 1,331 га, кадастровый номер – 642000000002000230	Начальная цена: 1 363 662,00 бел. руб. без учета НДС
Местонахождение: Минская область, Минский район, г. Молодечно, ул. Замковая, 33	Сумма задатка: 136 000,00 бел. руб.

Продавец имущества: ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **06 января 2022 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 21.12.2021 по 04.01.2022 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефонам: (017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

Телефоны для справок:
(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «СЧАСТЛИВЫЙ СЛУЧАЙ. 4 сезон. Тур 7»

1. Сведения об организаторе.

Общество с ограниченной ответственностью «Торговая компания Ромакс» (далее – Организатор). УНП 190761848. Зарегистрирован решением Минского горисполкома от 04.10.2006 г. № 2011. Регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 190761848.

Местонахождение Организатора: 220100, г. Минск, ул. Кульман, д. 35А, пом. 8.

Почтовый адрес: 220100, г. Минск, ул. Кульман, д. 35А, пом. 8.

2. Наименование Рекламной игры. «Счастливый случай. 4 сезон. Тур 7».

3. Территория проведения.

Магазины «Остров чистоты», «Остров чистоты и вкуса» на территории Республики Беларусь и интернет-магазины ostrov-shop.by, zht.by, zhs.by, zhi.by.

4. Сроки проведения.

14.10.2021 – 23.12.2021 (включая срок выдачи выигрышей и опубликования результатов проведения рекламной игры).

В Рекламной игре приняли участие 60 091 участник.

Состав и размер призового фонда. Источники формирования. Источником формирования призового фонда является имущество и денежных средства Организатора. Общий размер призового фонда составляет 62 121,35 (шестьдесят две тысячи сто двадцать один) рубль тридцать пять копеек

Призовой фонд разыгран полностью.

ФИО победителей Рекламной игры и их выигрыш:

Автомобиль Renault Logan, 2021 г. в., РФ, X7L4SRLVG67806506, стоимостью 31949,00 рубля и денежное вознаграждение в размере 122,38 рубля

№ п/п	№ Игрового кода	№ Дисконтной карты	Фамилия Имя Отчество
1	18876	1417688	Гутько Елена Петровна

Смартфон Xiaomi Redmi Note 10 Pro 6GB/128GB (Onyx Gray) стоимостью 969,00 рубля и денежное вознаграждение в размере 141,84 рубля

№ п/п	№ Игрового кода	№ Дисконтной карты	Фамилия Имя Отчество
1	3693	1515404	Рынкевич Елена Францевна
2	25585	2217208	Стефанович Янина Владимировна
3	55648	2474803	Мурашкевич Елена Николаевна
4	39800	3086697	Верених Оксана Николаевна
5	24576	3102081	Фикова Анастасия Александровна
6	57335	2641416	Романчук Вероника Евгеньевна
7	19237	1933316	Юревич Ольга Геннадьевна
8	60087	1436646	Романович Вероника Сергеевна
9	7751	1807910	Томиленко Ольга Анатольевна
10	13293	2044616	Галицкий Дмитрий Анатольевич

Контактный гриль DeLonghi CGH1012D стоимостью 888,792 рубля и денежное вознаграждение в размере 110,39 рубля

№ п/п	№ Игрового кода	№ Дисконтной карты	Фамилия Имя Отчество
1	24482	2878696	Олейникова Татьяна Леонидовна
2	22138	1312692	Голенко Вероника Сергеевна
3	35707	2274576	Бурлакова Юлия Викторовна
4	53035	2910577	Романчук Светлана Антоновна
5	34730	3015705	Беленок Максим Владимирович
6	1082	3844951	Бугай Андрей Петрович
7	51971	2439145	Залесская Елена Никифоровна
8	39449	2514460	Симакова Галина Григорьевна
9	57756	3602661	Болдин Игорь Николаевич
10	12677	1326097	Литвинчук Анна Алексеевна

Паровая швабра Karcher SC 2 Upright 1.513-345.0 стоимостью 294,00 рубля и денежное вознаграждение в размере 21,52 рубля

№ п/п	№ Игрового кода	№ Дисконтной карты	Фамилия Имя Отчество
1	55967	3272188	Прокопенко Юлия Николаена
2	6414	2429599	Федорова Любовь Владимировна
3	2217	2140081	Козлова Ирина Григорьевна
4	58016	4215321	Шамилова Стелла Фархадовна
5	9634	2403412	Ванчук Оксана Иосифовна
6	50254	3042479	Волкова Светлана Зигмундовна
7	1266	1784551	Счисленок Юлия Викторовна
8	24476	2874522	Календо Александр Николаевич
9	48916	1284825	Альхимович Евгения Александровна
10	49910	2571254	Чудакова Жанна Владимировна

Фитнес-трекер Xiaomi Mi Smart Band 6 BHR4951GL/XMSH15HM стоимостью 135,996 рубля

№ п/п	№ Игрового кода	№ Дисконтной карты	Фамилия Имя Отчество
1	18656	1559837	Кривошей Екатерина Александровна
2	35365	1561378	Колбасенко Галина Ивановна
3	60078	3628467	Калесинская Ольга Юрьевна
4	53110	1279786	Шашок Алина Викторовна
5	18897	1435718	Потоцкая Татьяна Владимировна
6	10380	4234917	Колос Анастасия Александровна
7	48627	4050197	Савицкая Зоя Геннадьевна
8	45889	2276677	Наумова Людмила Ивановна
9	31760	2108380	Навойчик Ольга Михайловна
10	6439	2483533	Анисько Жанна Петровна

Информацию об условиях участия и проведения Рекламной игры можно получить по телефонам «горячей линии»: +37544 700-13-33, +37533 686-37-37 с 09.00 до 21.00, а также на сайте ostrov-chistoty.by.

Свидетельство о государственной регистрации Рекламной игры № 4075 от 24.09.2021 г., выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь. Правила Рекламной игры опубликованы в газете «Звязда» № 196 (29565) от 12.10.2021 г.

Публикация результатов рекламной игры «Счастливый случай. 4 сезон. Тур 7» в настоящем номере газеты «Звязда» обусловлена ограничением возможности размещения результатов в газете «Комсомольская правда» в Белоруссии».

ХОД КАНЁМ,

альбо Дзед — ён такі... Ён можа...

Калі не стала майго дзядулі (Пятром яго звалі), бабулі было 52... Усяго...

Гэта цяпер я разумею, што яна, як многія жанчыны ў такім узросце, была яшчэ о-го-го — квітнела і пахла! А тады, у мае 12, нават 40 гадоў здаваліся старасцю, прычым беспрасветнай. Якія могуць быць кавалеры ў такім узросце? Які яшчэ замуж?

Шчыра кажучы, бабуля туды не рвалася. На знаёмых мужчын, якія час ад часу заходзілі пагаварыць за жыццё (магчыма, не без дальняга прыцэлу?), глядзела раўнадушна, а то і раздражнёна: ідзі, маўляў, спачатку кашулю папрасуй, чаравікі пачысці, жаніх.

...У тое сумнапамятнае лета — першае без дзядулі — мы з ёй жылі ўдзвюх. Яна хадзіла на працу, а яшчэ даглядала жыўнасць (ладнага парсючка Ваську, некалькіх трусоў і з дзясятак курэй), шчыравала на градах, завіхалася ў садзе... Я старалася дапамагаць, а вось ці паспяхова...

Той дзень пачаўся з непрыемнасці: Васька, наш парсючок, злёг — не ўзяўся есці. Бабуля тэлефанавала ветэрынару.

Ён, помню, з'явіўся, агледзеў парсючка, прапісаў уколы. Прычым рабіць іх падрадзіўся сам: і адзін раз, і другі прыехаў... А перад трэцім бабуля паклікала мяне і кажа:

— Слухай, дзіцятка... Дзядзька Мікола сёння зноў будзе Ваську ўкол рабіць. Мы з ім пойдзем у хлеў. Дык ты прыдумай што-небудзь і хвілін праз дзесяць падбяжы — у дзверы пастукай, пакліч, каб я выйшла.

— А навошта? — спытала я.

— Ну, як табе сказаць? — пачырванела бабуля. — Ён да мяне прыстае, чапляецца...

— Хто? Васька? — не зразумела я.

— Ды не, — засмяялася бабуля. — Дзядзька Мікола.

Тут ужо разгубілася я. Ды што там — мяне аж затрэсла ад абурэння! Як яму не сорамна, гэтаму дзядзьку?! Як ён можа?! Як яму ў галаву прыйшло чапляцца да такой пажылой жанчыны?!

І вось наступіў прызначаны час. Каля нашых веснічак спыніўся задрыпаны «УАЗік». Дзядзька Мікола выйшаў, паклікаў бабулю, і ўдваіх яны рушылі да хлява. Я паклала перад сабой гадзіннік і пачала адлічваць хвіліны: дзесяць... восем... пяць... адна і... Старт: я падхапілася, куляй паляцела да хлява і ўжо там з усёй сілы стала грукаць кулакамі ў дзверы. Яны тут жа адчыніліся:

— Што такое, дзіцятка? — спытала бабуля. — Што здарылася?

— Пайшлі дамоў, у хату! — залапатала я. — Хутчэй, бо там... Там...

— Што там? — не на жарт спужалася бабуля.

— Там цябе дзед Пеця шукае! — выпаліла я (нечакана нават для сябе).

Бабуля таксама здзівівілася: ледзь заўважна — краечкамі вуснаў — усміхнулася, а дзядзька Мікола неспадзеўкі дык нават прысеў над сваім чамаданчыкам — нешта ў ім стаў перабіраць.

— Ну вы ўжо тут самі, Іванавіч, — сказала яму бабуля, узяўшы мяне за руку. — А мы пойдзем — паглядзім, хто там мяне шукае.

Па дарозе да хаты яна яшчэ неяк трымалася, а ўжо там, у калідоры, адвяла душу — рассмяялася.

— І як табе гэта ў галаву прыйшло? — пытала ў мяне. — Мікола ажно збялеў!..

Больш, дарэчы, ён да нас не прыязджаў, прынамсі пакуль я гасцявала... Можа, патрэбы не было (Васька, дзякуй богу, паправіўся, есці стаў за траіх), а можа, і дзядулі баяўся?

Мы ж з бабуляй пасля гэтага выпадку яшчэ больш пасябравалі. У мяне не было ніякіх сакрэтаў ад яе, у яе ад мяне, думаю, таксама, асабліва калі я крыху падрасла.

А вось замуж другі раз бабуля так і не выйшла...

Алена Петрашкевіч,

Мінскі раён.

ХТО ПЫТАЕ, ТОЙ НЕ БЛУДЗІЦЬ, ХТО ШУКАЕ — ЗНОЙДЗЕ

Шкада, але ж з гэтым нічога не зробіш — лютуе каранавірус: адмяняе шумныя застоллі ды блізкія зносіны. З раднёй, з сяброўкамі ўсё больш па тэлефоне. І добра, што хоць так ды можна пагутарыць (а па скайпе дык яшчэ і ўбачыцца), нешта сваё ўспомніць...

Неяк раз пра пакупкі загаварылі, пра блат, дэфіцыт (амаль забытыя словы), і мая суразмоўніца, былая суседка, раптам прызналася, што я ў яе на падазрэнні была — у... крадзяжы.

Ад неспадзяванкі мне аж мову адняло! А справа, калі па парадку, выглядала так.

Некалі ў нашай вёсцы дзверы ніхто не замыкаў — нават ад чужых, а ўжо свае, суседзі дык адзін да аднаго часта шасталі: то запалак узяць, то цукру пазычыць, то грошай перахапіць, то пакупкі паглядзець...

Калготкі тады ў дэфіцыце былі. Дзяўчаты, жанчыны хадзілі ў панчохах, а зверху — у сукенках, спадніцах, сарафанах. Я, напрыклад, у дарогу яшчэ магла прыбрацца ў штаны, аднак на месцы (прыехаўшы на работу) абавязкова нацягвала спадніцу. Інакш проста нельга было: у школе ды іншых установах — дрэс-код, хоць слова гэтага ніхто і не ведаў.

...А калготкі пад тыя спадніцы найчасцей прывозілі з-за мяжы, даставалі мы іх па вялікім блаце і бераглі затым як зрэнку вока, можна сказаць, бо танюткія ж... Нечым зачапіў — «стрэлачка» пабегла. Каб «склеіць-злавіць», бралі лак для пазногцяў, шпількі-іголкі... І ўвогуле рэчамі тады не раскідваліся: куплялі рэдка, цэны помнілі доўга, а ўжо рады былі — дык кожнай абноўцы! Імпартным калготам — і пагатоў!

...Тая суседка шмат каму іх паказвала, хоць і здалёк: з пакеціка не даставала. А калі надумала дастаць, прымераць, пакецік... знік: як карова языком злізала, як не было!

Жанчына цэлы вечар шукала! Можна сказаць, што хату звярнула — няма!

Пасля гэтага ноч не спала: перабірала ў памяці, хто прыходзіў, дзе стаяў, як глядзеў, успамінала, што за кім вадзілася, ці не «быў заўважаны»...

Раніцай з хворай галавой паднялася, пайшла ў кухню. І снядаць там трэба рабіць, і з рук усё валіцца... Маразілку адкрыла, каб кавалачак сала ўзяць, і...

Аж вачам не паверыла: ляжыць там яе пакецік, як калготачкі! Галоўнае — успомніла, што сама іх туды паклала, каб перамерзлі і мацнейшыя потым былі, каб даўжэй насіліся.

...Факт, што з самай раніцы ў жанчыны дзве радасці былі: адна — што аднова знайшлася, а другая — што не паспела агучыць сваіх чорных думак, не сапсавала адносінаў.

Цяпер — паўстагоддзя пасля — ім, вядома ж, ужо нішто не пагражала: разам пасмяяліся ды ўсё.

Любоў Чыгрынава,

г. Мінск.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

АД ЯЕ ж і яшчэ раз сумнае: «Апошнія лісткі ў календары, сыходзіць год — самотны і стары...» А гэта значыць, завяршаецца конкурс на найлепшую вясёлую і праўдзівую гісторыю, надрукаваную ў 2021-м, «малюецца» адмысловая табліца, дзе будуць пералічаны ўсе — з прозвішчамі аўтараў, з датамі публікацый... І дзе потым, ужо ў новым годзе, з'явіцца балы...

Нагадаем, што выставіць іх — свае ўласныя, вызначыць дзясятку тых, што найбольш спадабаліся, і даслаць у рэдакцыю — права кожнага з чытачоў. Дык чаму б не скарыстацца ім, не дапамагчы невялічкаму рэдакцыйнаму журы падвесці вынікі...

На пачатку 2022-га мы аб'явім іх: назавём прозвішчы пераможцаў, узнагародзім адмысловымі дыпломамі і прызамі.

Зрэшты, не будзем смяшыць бога — раскажваць пра нашы планы. Будзем жыць! Пішыце.

Неасабісты суб'ектыў

Лёгкасць быцця і радасць жыцця,

або Як адчуць Новы год

У «Белпошты» — новая і, мяркуючы па ўсім, запатрабаваная паслуга — ліст ад Дзеда Мароза. Гэта калі не ты яму пішаш, а ён табе — у прыгожым «чароўным» канверце прыходзіць адмысловая паштоўка, падпісаная каліграфічным «дзедамарозаўскім» почыркам з навагоднімі пажаданнямі. Паколькі пісьмо не абы ад кага — яшчэ і падарунак невялікі ў тым канверце прыкладаецца — святочны пазлік. Карацей, для дзіцяці, якое верыць у барадатага чараўніка, нягледзячы ні на што, самае што ні ёсць матэрыяльнае пацвярджэнне, што ён насамрэч існуе. Бо тут нават бацькоў ці іншых сваякоў не западозрыш у прычыненасці да падману — яны ж і самі тое пісьмо ў рукі атрымаюць ад паштальёна, а заказаць яго ўвогуле можна праз інтэрнэт, нават на пошту не зазіраць... Такая вось выдатная прапанова падараваць малому (а можа, што захоча, дык і дарасламу) не адчуванне свята — хутчэй веру ў яго. Цана пытання — восем з нечым рублёў. А калі зможаш выдаткаваць у тры разы больш, дык твайму адрасату не толькі пісьмо — цэлы падарунак ад Дзеда Мароза паштальён прынясе...

Пасядзеўшы з паўгадзіны за камп'ютарам, я такіх пісьмаў аж тры штукі заказала і аплаціла іх тут жа ў інтэрнэт-банкінгу. Адразу прыйшоў на электронны адрас адказ: маўляў, усё правільна, заказ аформлены. Праз дзень атрымала яшчэ адно паведамленне — з указаннем нумара кожнага з заказаў, па якім я магу сачыць за іх перамяшчэннем. Карацей, шляхам невялікіх фізічных намаганняў і гэткіх самых грашовых укладанняў вырашылася пытанне, якое ў другой палове снежня стаіць,бадай, перад усім дарослым насельніцтвам краіны: чым парадаваць і здзівіць дзіця на Новы год. Бо ў тым, што нашы малыя (двое першакласнікаў і адна пяцігадовая гарэза) будуць радавацца тым пісьмам, можна нават не сумнявацца.

Што ж, можна задаволена ўздыхнуць, купіць яшчэ падарункі з цукеркамі (ужо ўласна ад сябе) і ехаць да малечы ў госці. Але нечага ўсё-ткі не хапае. А, вось яно — уласнага адчування свята і чароўнасці гэтага пераднавагодняга часу. Так-так, дакладна яго. І справа тут не ў адсутнасці снегу і марозу (бывала ўсякае), не ва ўзросце, у якім ужо верыць у цуды пад Новы год проста няёмка (верым жа, хоць трохі ўсё роўна верым, праўда?). Паклацаўшы пальцамі па клавіятуры, патузаўшы мышку на стале, яго дакладна не зловіш. Атрымліваецца, набыўшы вялікую палёгку ў арганізацыі святочнага настрою іншым, мы страчваем магчымасць стварыць яго сабе самім?..

Магчыма, да гэтага проста трэба прывыкнуць. Але ж не прывыкаецца. Размаўляла нядаўна са знаёмай, «маладой пенсіянеркай». Яна вельмі асцерагаецца коўдру і таму ў людныя месцы накшталт вялікіх магазінаў ці рынкаў не выходзіць увогуле. А тут — зазбіралася. «Трэба ж падарункі для родных купіць!». Пры гэтым на вельмі добрым узроўні валодае інтэрнэт-гандлем, шмат заказвае менавіта ў сецыве і выдатна ведае, як выбіраць тавар, як яго заказваць, аплачваць. Але ж не! «Новы год усё-ткі. Трэба яго адчуць. Лепш, чым на пераднавагоднім кірмашы, гэта нідзе не атрымаецца...» Вось так. Ужо і страх заразіцца па баку. Надзене дзве маскі на твар, але ўсё роўна пойдзе. Бо як жа яно — без адчування свята?

Думаю, яно заўсёды дарасламу чалавеку патрэбна было. Узяць тыя ж карнавальныя касцюмы. Мама мне іх шыла (менавіта шыла!) аж да шостага класа. Не тое што не было грошай, каб купіць гатовую «лісу» ці «вавёрку» (хоць і ў меншай колькасці, чым цяпер, яны і сорак гадоў таму прадаваліся). Майстраванне касцюма ператваралася ў цэлы пераднавагодні рытуал. Памятаю, у нейкім часопісе матуля ўбачыла касцюм навагодняй ёлкі. Цэлы тыдзень мы адмяралі марлю, фарбавалі яе зялёнкай, рабілі з кардону аснову для марлевай сукенкі, адмысловую высокую шапку з зоркай наверсе, малявалі і выразалі з паперы «цацкі», якія пасля наклейвалі на «ёлку»... Праз гады я не памятаю, ці заняла мая «ёлка» якое месца ў конкурсе касцюмаў, але дакладна, нібы гэта было ўчора, помню адчуванне свята, якое пасялялася ў нашай хаце, як толькі мы пачынналі майстраваць той убор. І мамін звонкі смех, і яе вясёлыя вочы, у якіх загаралася гарэзлівая, бы ў дзяўчынкі, іскрынка.

Тое самае я назірала летась, калі адна маладая бабуля ўзялася майстраваць для ўнучкі на ёлку касцюм сарокі. Цэлы тыдзень галоўныя навіны па тэлефоне былі менавіта пра гэта: з чаго рабілі крылы, як прыдумалі дзюбу, які маленькі капялюшык змайстравалі, «бо гэта ж сарока — такая фарсуха»! Бабуля была ў гэты час у такім прыўзнятым настроі, што я ёй нават зайздросціла. І нават не стала ў яе пытацца, чаму тую самую «сароку» яны не знайшлі і не заказалі праз інтэрнэт. (Цяпер там такі выбар, што пры жаданні нават касцюм анаконды знойдзеш).

Канешне, усе гэтыя знаходкі прагрэсу многім з нас вельмі аблягчаюць жыццё, што ў гэты шалёны час з яго дзікімі хуткасцямі, бясспрэчна, важна. Толькі як бы ў гэтай лёгкасці быцця не страціць радасць жыцця, без якой... Карацей, без якой і Новы год — не Новы год, вось пра што хацела сказаць.

Таму паштоўкі ад Дзеда Мароза — гэта добра, гэта выдатная знаходка. Але ўсё ж на наступным тыдні я збіраюся пайсці на пошту «ножкамі», уважліва разгледзець навагоднія паштоўкі, выбраць чыстыя, на якіх няма кімсьці напісаных банальных пажаданняў. Вечарам сесці за стол, узяць звычайную ручку і панапісваць на кожнай добрыя словы блізкім людзям, паставіць дату, падпісаць «Ваша Лена». Пакласці ў канверты, напісаць дакладныя адрасы, укінуць ранкам у паштовую скрыню на слупе каля прыпынку... І нарэшце зразумець і адчуць: хутка Новы год!

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «Трест Белсантехмонтаж № 1», г. Минск, ул. Я. Колоса, 23, к. 1**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б**
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов

№ лота	Наименование	Инв. №	Общ. пл., кв. м	Адрес	Начальная цена (с НДС 20 %), бел. руб.
1	Складское помещение № 8Н (расположено в подвале)	500/D-695622	36,5	г. Минск, ул. Якуба Коласа, д. 23, корп. 1, пом. 8Н	123 600,00
	Складское помещение № 11Н	500/D-70784559	43,5	г. Минск, ул. Якуба Коласа, 23/1-11Н	
2	Складское помещение № 9Н (расположено в подвале). Обременение: аренда	500/D-695623	59,5	г. Минск, ул. Якуба Коласа, 23/1-9Н	111 000,00
3	Складское помещение № 7Н (расположено в подвале)	500/D-695621	37,2	г. Минск, ул. Якуба Коласа, д. 23, корп. 1, пом. 7Н	66 000,00

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов: www.cpo.by. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

Задаток 10 % от начальной цены лота перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **10 календарных дней** после заключения договора купли-продажи. Передача предмета электронных торгов осуществляется в течение **5 календарных дней** после полной оплаты

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов **затраты** на их проведение и оплатить **вознаграждение** от цены продажи лота в течение **3 рабочих дней** после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 25.11.2021

Дата и время начала и окончания электронных торгов:
29.12.2021 с 11.00 до 13.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **27.12.2021 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 30 декабря 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

Предмет торгов
«Здание весовой АБЗ «Заславль» общей площадью 29,2 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 600/С-122807 (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание весовой АБЗ «Заславль» с навесом 1, забором а 1, металлическим ограждением площадки для стоянки автомобилей а2, асфальтная площадка на АБЗ «Заславль» а3, технологическая площадка по хранению и обработке материалов а4)
Сведения о земельном участке: площадь – 2,2169 га, кадастровый номер – 623650100001005211
Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17/1
Начальная цена: 1 193 630,40 бел. руб. с учетом НДС
Сумма задатка: 119 000,00 бел. руб.

Продавец имущества: ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

